Будучыня еўрапейскай бяспекі

# БЕЛАРУСЬ У НАТА





Януш
Анышкевіч



Андрус
Кубілюс



Луізэ
Ліцэ-Танэ



Сільвэр
Лойт



Кари
Люхто



Юрый
Фяльштынский




Іштван
Д’ярматы



Андрэй
Саннікаў



Паўло
Клімкін

# БЕЛАРУСЬ У НАТА



Фундацыя “Еўрапейская Беларусь”

Варшава 2023

Ад рэдактара ....................................................................4

ПОГЛЯД З ПОЛЬШЧЫ
Беларусь у НАТА?
Януш Анышкевіч ..............................................................6

ПОГЛЯД З ЛІТВЫ
Беларусь у НАТА: міф або рэальнасць?
Андрус Кубілюс ..............................................................17

ПОГЛЯД З ЛАТВІІ
Ацэньваючы Беларусь з пункту гледжання
рэгіянальнай бяспекі
Луізэ Ліцэ-Танэ ..............................................................30

ПОГЛЯД З ЭСТОНІІ
Тыраны не баяцца нейтралітэту
Сільвэр Лойт ..................................................................39

ПОГЛЯД З ФІНЛЯНДЫІ
Шлях Фінляндыі ў НАТА
Кары Люхто ....................................................................52

РАСЕЯ / ЗША
Беларусь як геапалітычны ключ да бяспекі Еўропы
Юрый Фяльштынскі ........................................................66

ПОГЛЯД З ВУГОРШЧЫНЫ
Шлях Беларусі ў НАТА
Іштван Д’ярмаці..............................................................74

ПОГЛЯД З БЕЛАРУСІ
Ключавое значэнне ўступлення Беларусі ў НАТА
для бяспекі Еўропы
Андрэй Саннікаў.............................................................87

ПОГЛЯД З УКРАІНЫ
НАТА як аптымальная мадэль будучай бяспекі
будучай Беларусі
Паўло Клімкін ...............................................................101

## *Ад рэдактара*

Пасля вайны, якую Расея распачала супраць Украіны, мяняецца архітэктура еўрапейскай, а фактычна і трансатлантычнай бяспекі. Еўрапейскія краіны, асабліва ва ўсходняй частцы кантынента, ужо сур'ёзна пераглядаюць сваю палітыку бяспекі, каб прыстасавацца да новых або ўзноўленых выклікаў, у тым ліку вайны, для забеспячэння стабільнага міру на кантыненце і ва ўсім свеце.

Асобная роля ў гэтым працэсе перагляду і пераасэнсаванні належыць «шэрым зонам».

Беларусь — адна з іх, і вельмі важная. З’яўляючыся акупаванай дыктатарскім рэжымам Лукашэнкі, які паставіў краіну ў поўную залежнасць ад Расеі, Беларусь стала плацдармам для маштабнага расейскага нападу на Украіну.

У той жа час масавыя пратэсты 2020 года супраць уладарання Лукашэнкі прадэманстравалі свету, што Беларусь не пацярпіць гэты рэжым, і ягоны крах — толькі пытанне часу.

Відавочна, што адзіны варыянт бяспекі для свабоднай Беларусі пасля вайны — гэта як мага хутчэйшае ўступленне ў НАТА.

Мэта гэтага праекта — вывучэнне не толькі магчымасцяў, але і практычных аспектаў будучага сяброўства Беларусі ў НАТА, разгляд пераваг і магчымых перашкод на гэтым шляху.

Серыя артыкулаў вядомых аўтараў, якія валодаюць унікальным досведам і разуменнем праблем бяспекі ў рэгіёне і сваіх краінах, дазваляе зірнуць на гэтае пытанне з розных пунктаў гледжання.

Беларусь мяжуе з Расеяй з аднаго боку, з другога - з краінамі, якія з'яўляюцца сябрамі НАТА, і Украінай, якая паставіла сваёй канстытуцыйнай мэтай стаць сябрам НАТА.

Як паказвае гісторыя, усходні сусед Беларусі ніяк не можа служыць чыннікам бяспекі. Акурат наадварот: на працягу стагоддзяў Расея была крыніцай небяспекі і пагрозай для незалежнасці і самога існавання Беларусі.

Балтыйскія суседзі Беларусі і Польшча зрабілі выбар на карысць бяспекі, якая гарантуецца NATO, і далучыліся да Альянсу, як толькі гэта стала магчымым.

Іх досвед і рэкамендацыі каштоўныя для абмеркавання гэтай тэмы.

Аўтары артыкулаў адзначаюць цяжкасці, з якімі сёння сутыкаецца Беларусь і з якімі яна сутыкнецца пры ўступленні ў НАТА. Пры гэтым падкрэсліваюцца бясспрэчныя перавагі такога сяброўства для бяспекі Беларусі і еўрапейскай бяспекі.

Новая архітэктура бяспекі, грунтаваная на калектыўным палітычным і вайсковым патэнцыяле еўрапейскіх краін, з'яўляецца абавязковай умовай квітучай і мірнай Еўропы, і Беларусь мае быць часткай такой Еўропы.

***Андрэй Саннікаў***

## *ПОГЛЯД З ПОЛЬШЧЫ*

## *Беларусь у НАТА?*

***Януш Анышкевіч***

Новай дэмакратычнай Беларусі, якая несумненна ўзнікне пасля натуральнага або вымушанага адыходу Лукашэнкі, давядзецца прымаць пастанову аб тым, якое месца яна хоча заняць на еўрапейскай палітычнай арэне, а таксама вызначаць свае прыярытэты і палітыку ў галіне бяспекі.

Беларусь сутыкнулася з падобным выклікам на пачатку 1990-х, калі Савецкі Саюз, утвораны гэтымі ж краінамі ў 1922 годзе, быў распушчаны ў снежні 1991 года пастановай лідараў Расеі, Украіны і Беларусі.

**Першай праблемай тады было вызначыць стасункі зноў утворанай незалежнай беларускай дзяржавы з іншымі дзяржавамі, якія пачалі з'яўляцца на тэрыторыі былога СССР. Асабліва важным было сфармаваць стасункі з Расеяй, якая абвясціла сябе правапераемніцай СССР і пэўна захацела захаваць свой статус лідара і гегемона над краінамі, што зноў узнікалі.**

У Беларусі склалася даволі спецыфічная сітуацыя. Са слоў вядомага беларускага аналітыка Валера Карбалевіча,

*"Феномен Беларусі быў у тым, што праз нізкі ўзровень самасвядомасці і нацыянальнай самаідэнтыфікацыі пытанне дзяржаўнага суверэнітэту стала яблыкам разладу і аб'ектам вострай палітычнай барацьбы".*

Такая барацьба праходзіла паміж часткай новай палітычнай эліты, накіраванай на праграмы стварэння і ўмацавання нацыянальнай ідэнтычнасці, адлучанай ад савецкай, і велізарнай часткай былых палітычных эліт, якія мелі больш кансэрватыўны падыход.

Такім чынам, у Беларусі ў наяўнасці было сутыкненне дзвюх тэндэнцый. Першая выразна адсочвалася найперш у дзейнасці Беларускага Народнага Фронту (БНФ). Яго задачай было стаць на шлях нацыянальнага будаўніцтва, грунтаваным на поўнай незалежнасці ад Расеі, уважаючы расейскі ўплыў за пагрозу развіцця самабытнасці беларусаў ды іхняй сапраўднай нацыянальнай ідэнтычнасці.

Аднак існавала іншая, нашмат больш кансэрватыўная тэндэнцыя, якая выяўляецца ва ўплывовай частцы палітычнай эліты, што не заўважала якіх-небудзь пагроз з боку Расеі. Грунтуючы свае довады перш за ўсё на рэальных патрэбах эканомікі і войска, а таксама культурнай блізкасці, гэтая частка эліты пастулявала падтрыманне блізкіх стасункаў з Расеяй.

Вынікі рэферэндуму, праведзенага ў траўні 1995-га (да таго, як Лукашэнка здолеў цалкам умацавацца ва ўладзе і ўзяць беларускае грамадства пад поўны

кантроль), з'яўляюцца важкім сведчаннем стаўлення гэтай большасці сучаснага беларускага грамадства да Расеі. На гэтым рэферэндуме пераважная большасць нібыта прагаласавала за аднаўленне расейскай мовы ў якасці афіцыйнай, за далейшую інтэграцыю з Расеяй і за прыняцце такіх дзяржаўных сімвалаў як сцяг і герб у стылі савецкай эпохі. Праблема ў тым, што невядома ў якой ступені вынікі рэферэндуму былі сфальсіфікаваныя.

Адной з арэн барацьбы за будучыню Беларусі стала пытанне дамоўных сувязяў паміж Беларуссю і Расеяй.

Інструментам, які мог бы дазволіць Расеі граць ролю гегемона, быў вайсковы хаўрус, вядомы як Ташкенцкае Пагадненне аб калектыўнай бяспецы, укладзенае ў траўні 1992 года. Яно мела стаць падставай далейшага вайсковага супрацоўніцтва паміж яго падпісантамі і забяспечыць агульныя гарантыі бяспекі.

Гэтае Пагадненне было падпісанае шасцю краінамі: Арменіяй, Казахстанам, Кіргізстанам, Расеяй, Таджыкістанам і Узбекістанам. Беларусь яго не падпісвала, але быў моцны ціск з боку кансерватыўных колаў, што прывяло да падпісання ў Маскве ў ліпені 1992 года пагаднення аб шчыльным супрацоўніцтве паміж узброенымі сіламі абедзвюх краін.

Тэза аб нейтралітэце ўрэшце ўвайшла ў вайсковую дактрыну Беларусі, прынятую годам пазней у наступнай рэдакцыі: *"Рэспубліка Беларусь, улічваючы яе геапалітычнае становішча, будзе імкнуцца дасягнуць у сваёй незалежнай замежнай палітыцы ста-*

*тусу пазаблокавай, бяз'ядзернай і нейтральнай дзяржавы".*

Перакручаная і дзіўная заява Міністэрства юстыцыі Беларусі пра поўную адпаведнасць падпісаных пагадненняў аб вайсковым супрацоўніцтве і Ташкенцкага Пагаднення вышэйназваным тэзам аб нейтралітэце праклала шлях да ратыфікацыі гэтага пагаднення ў красавіку 1993 года. У выніку Беларусь стала на сцяжыну павелічэння вайсковай і палітычнай залежнасці ад Расеі.

Сённяшняя Беларусь пры ўсёй уяўнай незалежнасці палітычна і эканамічна цалкам залежыць ад Расеі. Што да яе ўзброеных сіл, то яны практычна цалкам інтэграваныя ў заходнюю групоўку расейскага войска.

Новай, дэмакратычнай Беларусі, якая жадае цалкам аднавіць свой суверэнітэт, давядзецца, такім чынам, скасаваць усё, што было ўчыненае Лукашэнкам і, перш за ўсё, зрабіць стратэгічны выбар аднаго з наступных трох магчымых кірункаў.

Выбар першага азначаў бы прызнанне Расеі ў якасці патэнцыйнай пагрозы асноватворным інтарэсам Беларусі, такім як нацыянальны суверэнітэт і бяспека меж, а таксама прызнанне неабходнасці ўсебаковага развіцця, грунтаванага на блізкіх сувязях з Захадам.

Гэта магло б прычыніцца да пошуку бяспекі, грунтаванай на сяброўстве ў НАТА.

Такая праграма вельмі радыкальная. Перш за ўсё, Беларусі давялося б цалкам перабудаваць існую развітую сістэму палітычных і вайсковых сувязяў з Ра-

сеяй. А яны цяпер вельмі моцныя, што зніжае статус Беларусі практычна да статусу сатэліта Расеі, і пагражаеператварэннем яе ў суб'ект Расейскай Федэрацыі.

Пры такім выбары неабходна было б пачаць выхад з Саюза Беларусі і Расеі і з усіх пастаноў і абавязкаў, прынятых у яго рамках. Далей давялося б пакінуць Супольнасць Незалежных Дзяржаў (СНД) і Арганізацыю Дамовы аб калектыўнай бяспецы (АДКБ) — звязу, створанага нібыта паводле мадэлі НАТА, у які было пераўтворанае Ташкенцкае Пагадненне, і вызваліць беларускія ўзброеныя сілы ад усіх арганізацыйных, асабовых і дактрынальных сувязяў з узброенымі сіламі Расейскай Федэрацыі. У той час як адрозненне ў вайсковай тэхніцы беларускага войска з аналагамі, якія выкарыстоўваюцца ў НАТА, не з'яўляецца асноўнай перашкодай (хоць сістэмы сувязі, распазнавання, паветранай абароны і структуры давядзецца мяняць), варта было б звярнуць увагу на надзейнасць сакрэтных службаў. У НАТА ахова сакрэтнай інфармацыі, што супольна выкарыстоўваецца, знаходзіцца ў веданні нацыянальных службаў, якія павінны гарантаваць надзейнасць і ўстойлівасць да інфільтрацый і выцекаў. Дадатковая праблема — неабходна ведаць ангельскую мову, працоўную мову альянсу.

**Да НАТА далучаюцца не ўзброеныя сілы, а ўся краіна. Гэта мае быць дэмакратычная дзяржава з моцнымі і прызнанымі дэмакратычнымі інстытутамі, дзе створа-**

**ныя дзейсныя перашкоды карупцыі і ёсць здаровая рынкавая эканоміка. І апошняе, (але не меншае значнасцю) – гэта мае быць краіна, дзе ажыццёўленыя асноватворны прынцып цывільнага кантролю над узброенымі сіламі, які робіць узброеныя сілы не чыннікам уплыву на дзяржаўную палітыку, а важным, але толькі інструментам дэмакратычна абраных улад.**

Праграма сяброўства ў НАТА мае быць прынятая большасцю значных палітычных сіл, якія з'явяцца ў дэмакратычнай Беларусі, і большасцю беларускага грамадства. І зрабіць гэта будзе зусім не лёгка. Ва Украіне большасць палітычных эліт была за ўступленне Украіны ў НАТА, але ўспрыманне НАТА ўкраінскім грамадствам было іншым. На працягу гадоў сярэдні ўкраінец успрымаў альянс, у адпаведнасць з савецкім і затым расейскім наратывам, як варожы і агрэсіўны пакт і важны інструмент дамінавання ЗША. Змена гэтага меркавання ішла з нарастаннем і канчаткова сфармавалася пасля грубага расейскага ўварвання.

Натуральным і лагічным дадаткам такой праграмы збліжэння з Захадам мае стаць уступленне ў Еўрапейскі Звяз, што ў канчатковым выніку стабілізуе міжнароднае становішча дэмакратычнай Беларусі.

Аднак асноўнай праблемай будзе рэакцыя Расеі на такую праграму. Для Расеі Беларусь не мае такой жа важнасці як Украіна, якая з'яўляецца часткай ра-

сейскай нацыянальнай міфалогіі і дэтэрмінантай статусу Расеі як звышдзяржавы. Беларусь для Расеі не толькі акно ў Еўропу, але і перадусім зона фундаментальнай стратэгічнай важнасці. У Маскве ўсё яшчэ культывуецца ўспамін пра тое, што войскі Польшчы, Напалеона і Гітлера, якія ішлі маршам на Маскву, праходзілі праз тэрыторыю Беларусі, хоць забываецца, што адзіная перманентная пагроза расейскаму суверэнітэту прыйшла з Усходу, ад мангольскай імперыі Чынгісхана.

Застанецца адкрытым пытанне, ці захоча Расея заблакаваць уваходжанне Беларусі ў НАТА, ужыўшы ўзброеную сілу, як было ў выпадку з Украінай. Аднак, калі такое адбудзецца, узнікае пытанне, ці будзе Беларусь гатовая да такога адказу, які далі ўкраінцы ў аналагічнай сітуацыі. Беларусь – краіна нашмат меншая за Украіну, з іншымі ўзроўнем самасвядомасці і гістарычным досведам. І няясна, ці захоча палітычны Захад падтрымаць Беларусь у яе няроўнай барацьбе, як было ў выпадку з Украінай.

Шмат што будзе залежаць ад таго, як скончыцца вайна ва Украіне, або, прынамсі, як скончыцца актыўная фаза супрацьстаяння, якой тады стане Расея і наколькі моцны будзе Захад з прычыны стомленасці ад вайны. Калі ў Расеі, нават пасля Пуціна, не зменіцца яе імперская і агрэсіўная палітыка, новае ўварванне, у Беларусь, мае высокую імавернасць, асабліва таму, што палітычны Захад будзе, пэўна, не ахвочы ўлазіць у яшчэ адзін канфлікт. Асобныя краіны, напрыклад Польшча, магчыма, гатовыя да такога сцэнару, але гэтага, вядома, будзе недастаткова.

Найбольш аптымістычны варыянт, а менавіта вяртанне Расеі да ўсталявання рацыянальных стасункаў з Захадам, малаімаверны, хоць і не выключаны. У такой сітуацыі неўнікнёнае супрацьдзеянне Расеі ўваходжанню Беларусі ў НАТА магло б абмежавацца спрэс палітычнымі або эканамічнымі захадамі. Аднак застаецца пытанне, што калі зменшыцца небяспека агрэсіі Расеі, ці не будзе пераважаць у шмат якіх краінах той пункт гледжання, што не варта напружваць стасункі з Расеяй, якая змяняецца палітычна, і згаджацца на ўключэнне Беларусі ў альянс.

Другі магчымы варыянт — гэта захаваць сувязі з Расеяй, але дакладна перафармуляваць іх з тым, каб захаваць суверэнітэт, нацыянальную ідэнтычнасць і добрыя магчымасці для эканамічнага і цывілізацыйнага развіцця. Гэта азначала б, з аднаго боку, адмову ад стварэння адзінай саюзнай дзяржавы з Расеяй, аднаўленне палітычных кантактаў з Захадам, адкрыццё эканомікі для замежных інвестыцый і аўтаномнасць абароннай галіны. З другога боку, захаванне мытнага звязу з Расеяй і прыняцце пагаднення, якое рэгулюе прынцыпы супрацоўніцтва і гарантуе Расеі яе фундаментальныя інтарэсы ў галіне бяспекі.

Цяжка паверыць, аднак, што нават пры такім фармальным аслабленні сувязяў з Расеяй знікне небяспека павольнага ўзнаўлення цяперашняй (саюзнай) дзяржавы і працягу папярэдняй палітыкі ператварэння Беларусі ў русіфікаваны суб'ект Расейскай Федэрацыі. Давайце ўспомнім, што ў зборніку "Галасы з Расеі" адзін з найболей ліберальных і непрадузятых

расейскіх мысляроў Герцэн напісаў у сярэдзіне 19-га стагоддзя, што "замест русіфікацыі беларусаў і літоўцаў гвалтам для дзяржавы больш эфектыўна пакінуць гэтыя змены часу і сіле рэалій... Менавіта так русіфікаваліся фіны ды іншыя плямёны".

Трэці варыянт — скапіяваць, з магчымымі мадыфікацыямі, тыя стасункі, якія мела Фінляндыя з Расеяй пасля заканчэння Другой сусветнай вайны. Паводле гэтай мадэлі Беларусь, як і Фінляндыя, дала б Расеі неабходныя гарантыі і абавязанні бяспекі, атрымаўшы наўзамен поўную свабоду ва ўнутранай палітыцы і эканамічным супрацоўніцтве з Захадам. Такая пастанова, на думку шмат якіх заходніх краін, імаверна, была б найлепшай, або, сказаўшы больш шчыра, самай зручнай і менш патрабавальнай для Захаду. Аднак яна, як і папярэдняя, можа стацца няўстойлівай. Урэшце Фінляндыя з важкіх прычын апынулася як у Еўрапейскай Уніі, так і ў НАТА.

**Той выбар, які зробіць дэмакратычная Беларусь, стане вынікам вонкавай палітычнай сітуацыі на момант яго прыняцця. Ён таксама будзе залежаць ад палітычнай сітуацыі ўнутры краіны і ад таго, якую форму прымуць нацыянальная свядомасць і жаданні беларускага грамадства, а таксама ад цвёрдасці іх рэалізаваць. Мы ў Польшчы можам толькі спадзявацца, што такія жаданні будуць мець еўрапейскі характар, і што мы зможам апынуцца, разам з Беларуссю, у**

**агульным еўрапейскім і атлантычным звязе нацый.**

У 2004 годзе Валер Карбалевіч (якога я ўжо цытаваў) пісаў:

*«У Беларусі ёсць адна важная з'ява ў грамадскай свядомасці. Парадаксальна, але ёсць дзве ідэі, якія на першы погляд цяжка пагадзіць: адсутнасць альтэрнатывы, акрамя інтэграцыі з Расеяй, і прызнанне беларускай дзяржаўнасці і суверэнітэту. (...) З аднаго боку, большасць беларусаў мае ўстойлівы комплекс незакончанай нацыянальнай вартасці, няверу ў магчымасць захаваць нацыянальную ідэнтычнасць і інстынктыўнае імкненне ўліцца ў большую дзяржаву. Але з другога боку, яны не хочуць поўнага спынення сваёй беларускай дзяржаўнасці. Аптымальным варыянтам, які мог бы задаволіць значную частку беларускага электарату, было б прамежкавае становішча паміж поўным аб'яднаннем і поўнай незалежнасцю».*

Беларускае грамадства сёння, вядома, не такое, як у 2004 годзе. Тым не менш, якія варыянты будуць адкрытыя і якія варыянты будуць абраныя, яшчэ невядома.

Мы ў Польшчы можам толькі трымаць пальцы скрыжаванымі і жадаць таго, што выбар ды імкненні беларусаў будуць еўрапейскімі і што мы зможам апынуцца разам з Беларуссю ў агульнай еўрапейскай і атлантычнай супольнасці нацый.



***Януш Анышкевіч*** *— выдатны польскі палітык. Ён скончыў матэматычны факультэт Варшаўскага ўніверсітэта. У 1980-х гадах Анышкевіч быў прадстаўніком руху "Салідарнасць". Яго некалькі разоў арыштоўвалі ды інтэрнавалі. Пасля падзення камунізму ў 1989 годзе Анышкевіч стаў дэпутатам польскага Сэйма. Яго абіралі ў Сэйм з траўня 1989 года да 2001 года. Увесну 1990 года Анышкевіч стаў першым цывільным намеснікам міністра ў Міністэрстве абароны, дзе дамінавалі камуністы. Пазней Анышкевіч двойчы быў міністрам абароны: у 1992-1993 і 1997-2000 гадах. З 2004 да 2009 года ён быў сябрам Еўрапейскага парламента і быў абраны віцэ-прэзідэнтам парламента. Гэтую пасаду ён займаў з 2004 да 2007 года. Дарадца міністра нацыянальнай абароны ў 2010-2015 гадах.*

*Януш Анышкевіч актыўна займаўся справамі Беларусі. За сваю дзейнасць ён двойчы быў высланы з Беларусі ўладамі.*

*З 2004 года займае пасаду старшыні Рады Еўраатлантычнай асацыяцыі (Польшча).*

# *ПОГЛЯД З ЛІТВЫ*

## *Беларусь у НАТА:*
## *міф або рэальнасць?*

***Андрус Кубілюс***

Пытанне пра будучыя стасункі Беларусі і НАТА сёння здольнае выклікаць іранічную ўсмешку ў сяго-таго, бо гэтая ідэя можа падацца адарванай ад рэальнасці. Аднак сярод геапалітычных узрушэнняў, якія скаланаюць увесь еўрапейскі кантынент, усякія пытанні пра будучыню Беларусі не гучаць наіўна альбо заўчасна.

Вядома, абмеркаванне будучых стасункаў Беларусі і НАТА прадугледжвае, што мы гаворым пра будучыя стасункі паміж дэмакратычнай Беларуссю і НАТА, бо пакуль тыран Лукашэнка фактычна кіруе Беларуссю, гэта мае мала сэнсу або ўвогуле бессэнсоўна.

Патэнцыйныя лідары дэмакратычнай Беларусі на працягу гадоў фармавалі праеўрапейскую геапалітычную сістэму каардынат, мэты і памкненні Беларусі пасля падзення рэжыму Лукашэнкі. Гэта вельмі важна, бо дазваляе народу Беларусі, які ўсё яшчэ жы-

ве ў варунках рэпрэсій, зразумець, у якім кірунку дэмакратычныя сілы будуць весці Беларусь, калі яе народ зноў здабудзе права і свабоду вызначаць лёс сваёй краіны пасля падзення рэжыму.

> **Беларусы, вярнуўшы свае дэмакратычныя свабоды, апынуцца перад даволі простым выбарам: жыць нармальным і бяспечным еўрапейскім жыццём або адхіліць такую перспектыву, уважаючы за лепшае заставацца закладнікамі пасляімперскай палітычнай культуры, якая натхняецца ўсходнім ладам жыцця.**

Як паказвае досвед апошніх некалькіх дзесяцігоддзяў існавання ўсходнееўрапейскіх краін, як толькі гэтыя краіны аднавілі дэмакратычныя правы, яны імкнуліся дыстанцыявацца ад аўтарытарнай пуцінскай Расеі, яны імкнуліся як мага хутчэй інтэгравацца ў заходнія еўраатлантычныя структуры. Так было з Грузіяй, Украінай, Малдовай, а цяпер гэты шлях абрала і Арменія. Няма ніякіх рацыянальных довадаў, якія дазваляюць меркаваць, што дэмакратычная Беларусь не выбера той жа шлях. Таму можна з упэўненасцю канстатаваць, што дэмакратычная Беларусь будзе рухацца ў кірунку заходняй інтэграцыі, бо гэта адзіны спосаб гарантаваць бяспеку і роскві́т свайго народа на еўрапейскім кантыненце.

Надоечы беларускія дэмакратычныя сілы пацвердзілі, што дэмакратычная Беларусь будзе

імкнуцца стаць сябрам Еўразвязу. Вядома, канчатковы геапалітычны выбар зробіць народ дэмакратычнай Беларусі, калі верне сабе права і свабоду прымаць такія пастановы.

**Беларускія дэмакратычныя сілы і ўстановы Еўрапейскага Звязу ўжо могуць пачаць падрыхтоўку да будучай інтэграцыі, а таксама пачаць распрацоўку і анансаванне праекта будучага Пагаднення аб асацыяцыі, бо такое пагадненне стане першым крокам на шляху да інтэграцыі.**

Акрамя таго, трэба вызначыць, якімі будуць стасункі паміж дэмакратычнай Беларуссю і НАТА. У гэтым выпадку варта ўлічыць базу паняццяў і падставы што да такіх стасункаў, праводзячы адрозненні паміж імі скрозь прызму двух істотна розных сцэнароў геапалітычных змен у рэгіёне:

а) Расея разам з Беларуссю становіцца на шлях дэмакратычных пераўтварэнняў, або

б) Расея застаецца пад уладай аўтарытарнага рэжыму.

Чаму варта адрозніваць гэтыя два сцэнары?

Найперш варта закрануць тэму таго, як могуць адбывацца дэмакратычныя змены ў самой Беларусі. Ёсць некалькі тэарэтычна магчымых сцэнароў, у залежнасці ад таго, ці будуць такія змены адбывацца ў Беларусі і Расеі адначасова або ў розны час.

Па-першае, варта адзначыць, што асноўным трыгерам такіх змен можа стаць поўная перамога Украіны ў вайне з Расеяй, якая прымусіць Расею вывесці свае войскі з усіх акупаваных тэрыторый Украіны. У гэтым выпадку можна чакаць, што зрынутая Расея стане сведкам падзення крамлёўскага рэжыму, і ў той жа час унутры Расеі пачнуцца дэмакратычныя пераўтварэнні. Адначасова з гэтым у Беларусі абрынецца і рэжым Лукашэнкі, які ёсць стаўленікам Крамля.

**Іншы магчымы сцэнар грунтуецца на тым, што перамога Украіны прычыніцца толькі да падзення рэжыму Лукашэнкі дзякуючы беларускаму палку Каліноўскага, які прыйдзе ў Беларусь пасля перамогі ва Украіне.**

Апроч падзей у Расеі, значныя змены могуць адбыцца і ў Беларусі ў выпадку, калі Лукашэнка, які ўжо даўно меў прыкметныя праблемы са здароўем, нарэшце сканае або выявіцца няздольным кіраваць краінай з іншай прычыны. Гэта адчыніць акно магчымасцяў для значных змен, дзякуючы цяперашняй палітычнай і бізнэс-эліце Беларусі, якая вызваліцца ад дыктатуры Лукашэнкі. Гэта азначала б пачатак “беларускай перабудовы”, якая, як і савецкая перабудова за часамі Гарбачова, у канчатковым выніку вырвецца з-пад кантролю “перабудовачнай эліты” і ператворыцца ў сапраўдную дэмакратыю.

Акрамя таго, Беларусь можа пайсці шляхам, аналагічным таму, што прайшлі Украіна або Арменія ў свой час, незалежна ад пераўтварэнняў у Расеі. Там, напрыклад, блізкія да Крамля рэжымы Януковіча і Саргсяна былі скінутыя ў выніку масавых акцый у падтрымку дэмакратыі.

Лукашэнка жорстка здушыў першую такую спробу ў 2020 годзе, але гэта не касуе гістарычнай тэндэнцыі на постсавецкай прасторы, дзе дэмакратыя спакваля, але няўхільна распаўсюджваецца ад заходніх меж ва ўсходнія рэгіёны. З улікам такой гістарычнай заканамернасці дэмакратычныя перамены маюць адбыцца найперш у самой Беларусі і толькі потым распаўсюдзіцца на тэрыторыю Расеі. Прыклад Беларусі мог бы істотна стымуляваць насельніцтва Расеі.

У кожным выпадку, будучыя дэмакратычныя стасункі Беларусі з НАТА варта разглядаць у кантэксце двух магчымых сцэнароў развіцця падзей у Расеі: а) Беларусь ідзе шляхам дэмакратычных змен, у той час як аўтарытарны рэжым далей кіруе Расеяй, і б) Расея і Беларусь адначасова ідуць шляхам дэмакратычных пераўтварэнняў.

## І. Аўтарытарная Расея і дэмакратычная Беларусь

Цалкам відавочна, што аўтарытарная Расея будзе выступаць супраць дэмакратычных змен у Беларусі і, як толькі яны адбудуцца, паспрабуе разладзіць

дэмакратыю ў Беларусі ўсімі даступнымі ёй сродкамі, у тым ліку вайсковым шляхам паставіць пад пагрозу яе бяспеку. Дэмакратычная Беларусь з’яўляецца пагрозай для аўтарытарнага рэжыму ў Крамлі не таму, што яна будзе імкнуцца да Еўрапейскага Звязу або НАТА, пагражаючы тым самым бяспецы Расеі, а таму, што інтэграцыя Беларусі з Захадам паставіць само існаванне крамлёўскага рэжыму пад пагрозу. У Крамлі выдатна разумеюць, што інтэграцыя Беларусі з Захадам — гэта адзіная магчымасць паспяховага стварэння ў Беларусі варункаў для нармальнага еўрапейскага ладу жыцця. Дакладна такія варункі ствараліся ў Цэнтральнай Еўропе і ў краінах Балтыі на працягу апошніх дзесяцігоддзяў, а цяпер ствараюцца ва Украіне, Малдове, Арменіі ды Грузіі. Паспяховая інтэграцыя Беларусі з Еўрапейскім Звязам небяспечная толькі для крамлёўскага рэжыму (а не самой Расеі), таксама як і інтэграцыя Украіны з Еўрапейскім Звязам нясе пагрозу толькі для крамлёўскага рэжыму.

**Поспех беларускай і ўкраінскай дэмакратый, якія стануць натхняльнымі і вартымі пераймання прыкладамі для расейскага народа, пахісне падваліны аўтарытарнага крамлёўскага рэжыму.**

Няма сумневаў у тым, што расейскі народ, бачачы поспехі Украіны і Беларусі, будзе ўсё часцей задаваць пытанне, чаму такія дэмакратычныя змены

не адбываюцца ў Расея, але яны азначалі б канец рэжыму Пуціна.

Ясна, што рэжым Пуціна распачаў агрэсіўную вайну супраць Украіны, баючыся перспектыў перамогі дэмакратыі. Таксама ён быў напалоханы народнай рэвалюцыяй у Беларусі, якая прадэманстравала, што меркаваная лаяльнасць, якую беларусы нібыта выяўлялі да рэжыму Лукашэнкі раней, была поўнай фікцыяй, якая выпарылася падчас першых масавых пратэстаў. Пуцін зразумеў, што лаяльнасць простых расейцаў да ягонага аўтарытарнага крамлёўскага рэжыму — гэта таксама фікцыя, якая можа рассеяцца таксама хутка. Пачаўшы вайну супраць Украіны, Пуцін імкнуўся не толькі перапыніць смяротна небяспечную для ягонага рэжыму траекторыю поспеху Украіны, але і запалохаць народ Беларусі — паглядзіце, што вас чакае, калі вы, як украінцы, будзеце імкнуцца да дэмакратыі і еўрапейскай інтэграцыі. Так, Пуцін меў дзве мэты: па-першае, пазбавіць простых расейцаў ад якой бы там ні было спакусы пільнавацца прыкладу сваіх суседзяў і дэмакратыі, якая перамагла ў іхніх краінах. Ён, безумоўна, спадзяваўся здушыць такія магчымасці моцай зброі. Па-другое, затлуміць галовы сваіх суграмадзян прапагандай і захапіць іх ваеннымі падзеямі.

Таму перспектывы дэмакратычнай Беларусі знаходзяцца ў дырэктыўнай залежнасці ад перамогі Украіны ў найбліжэйшай будучыні, якая пераканае беларусаў і расейцаў, што Пуцін не здольны

перашкодзіць поспеху дэмакратыі ва Украіне. Такім чынам, ён будзе няздольны перашкодзіць поспеху дэмакратыі ў Беларусі, калі яна пойдзе тым жа шляхам.

Вайна Расеі супраць Украіны — гэта балючая навука для дэмакратычных краін Захаду, чыя даўняя і памылковая геапалітычная пазіцыя прычынілася да таго, што Пуцін у канчатковым выніку наважыў, што ён можа распачаць агрэсіўную вайну супраць Украіны, і Захад не адрэагуе адэкватна, таксама як Захад не здолеў адэкватна адрэагаваць на вайну ў Грузіі ды акупацыю Крыма. Галоўнай памылкай Захаду было пакінуць Украіну ў "шэрай" зоне бяспекі без рэальных перспектыў інтэграцыі з ЕЗ або НАТА. Нават пасля таго, як Украіна цвёрда выбрала шлях дэмакратычных пераўтварэнняў і еўрапейскай інтэграцыі ў 2014 годзе, Захад меркаваў, што інтэграцыя Украіны не мае "правакаваць Пуціна" і пільнаваўся гэтай пазіцыі, але менавіта гэта і справакавала агрэсію Пуціна, бо Захад не адчыніў дзверы для інтэграцыі і пакінуў Украіну ўсё ў той жа "шэрай" зоне.

Здаецца, Захад ужо ўсвядоміў сваю памылку, таму Украіна і Малдова сталі кандыдатамі на сяброўства ў ЕЗ, і перамовы аб іх сяброўстве, мабыць, пачнуцца неўзабаве. Чакаецца, што абедзве краіны стануць сябрамі ЕЗ пад 2030 год. Таксама імаверна, што і НАТА ў найбліжэйшай будучыні накіруе такое запрашэнне Украіне. Такім чынам, Украіна нарэшце выйдзе з небяспечнай “шэрай” зоны.

Гэтую навуку неабходна ўлічыць у канцэпцыі новай заходняй бяспекі на еўрапейскім кантыненце: дэмакратыі, якія ўзнікаюць і ўсталёўваюцца ў краінах-суседзях усходняга ЕЗ, не маюць заставацца ў "шэрай" зоне геапалітычнай бяспекі, бо гэта толькі стварае спакусу і правакуе агрэсію аўтарытарнага рэжыму ў Крамлі супраць суседніх дзяржаў, якія знаходзяцца ў працэсе станаўлення як дэмакратычныя дзяржавы.

Таму, у той час як Расея будзе знаходзіцца пад акупацыяй аўтарытарнага клептакратычнага рэжыму, не толькі сама Беларусь, здабыўшы дэмакратыю, павінна шукаць абароны свайго дэмакратычнага ладу шляхам інтэграцыі ў еўраатлантычныя арганізацыі, у тым ліку НАТА і ЕЗ, але і Захаду трэба дэманстраваць зацікаўленасць у інтэграцыі дэмакратычнай Беларусі і прапаноўваць для яе гарантыі бяспекі.

## II. Дэмакратычная Расея і Дэмакратычная Беларусь

Пераход Расеі ад аўтарытарнай дзяржавы да дэмакратычнай рэспублікі станецца найбольш значнай зменай у архітэктуры бяспекі ўсяго еўрапейскага кантынента. Дэмакратычныя краіны не вядуць войны адна з адной. Гэта азначала б спыненне агрэсіўнай палітыкі Расеі ў дачыненні да ўсіх дэмакратычных суседзяў. Поспех дэмакратычных суседзяў больш не пагражаў бы аўтарытэту дэмакратычнай Расеі, а, на-

адварот, спрыяў бы здаровай канкурэнцыі для дасягнення такога ж узроўню ў самой Расеі.

Такая геапалітычная сітуацыя выкліча шырокі спектр пытанняў, напрыклад, аб будучых мэтах НАТА. НАТА было заснаванае ў 1949 годзе для абароны Захаду ад агрэсіўнай экспансіі аўтарытарнай сталінісцкай Расеі (Савецкай Імперыі) у Заходняй Еўропе. Пагрозы агрэсіі не існавала б без аўтарытарнага рэжыму ў Расеі. Можа здацца, што ў такім выпадку не толькі дэмакратычнай Беларусі больш не трэба будзе разглядаць пытанне аб сяброўстве ў НАТА, але і самой арганізацыі давядзецца пераасэнсаваць падставы свайго далейшага існавання ў варунках адсутнасці пагрозы з боку аўтарытарнага рэжыму. Што тады рабіць НАТА? Ад каго бараніць Еўропу?

Аднак існуе сур'ёзны стратэгічны аргумент на карысць таго, чаму НАТА варта не толькі захаваць, але і павялічыць за кошт дэмакратычнай Беларусі, не кажучы ўжо пра Украіну, і нават пасля таго, як Расея ператворыцца ў дэмакратычную дзяржаву. Больш за тое, гэта было б неабходна і самой дэмакратычнай Расеі.

Неўзабаве пасля дэмакратычных пераўтварэнняў Расея сутыкнецца з тыповай для ўсіх імперый на стадыі раскідання з'явай — настальгіяй грамадства аб былой велічы імперыі. Гэта ўжо стварала сур'ёзныя праблемы для дэмакратычнага ладу былых імперый. Дэмакратычны лад Расеі не змог вытрымаць такіх

хваль настальгіі за часамі Ельцына, а Пуцін актыўна распальваў гэтую настальгію пасля прыходу да ўлады. Відавочна, што дэмакратычная Расея, калі яна адродзіцца, сутыкнецца з аналагічным выклікам. Гэтым разам Захад можа істотна дапамагчы расейскай дэмакратыі ў супрацьстаянні пагрозе “пасляімперскай настальгіі”. Захад павінен сваімі дзеяннямі паказаць, што Расея больш не мае шанцаў на аднаўленне імперыі, бо і Украіна, і дэмакратычная Беларусь будуць надзейна інтэграваныя ў заходнія арганізацыі ў сферы бяспекі (NATO) і эканомікі (ЕЗ).

Як сказаў Збігнеў Бжэзінскі, "Расея з магчымасцямі кантролю Украіны (і Беларусі) заўсёды застанецца імперыяй, а Расея, якая страціла гэтыя магчымасці, здолее дасягнуць дэмакратыі". Сяброўства Беларусі і Украіны ў НАТА стане выяўным сігналам таго, што ў Расеі ніколі больш не будзе магчымасці кантраляваць гэтыя краіны. Гэта было б вельмі карысна для зноў утворанай расейскай дэмакратыі.

**Таму дэмакратычнай Беларусі ў кожным выпадку неабходна будзе імкнуцца да сяброўства ў НАТА не толькі дзеля абароны ад аўтарытарнага рэжыму ў Крамлі, але і дзеля дэмакратычнай Еўропы і ўстойлівага міру на ўсім еўрапейскім кантыненце.**

Дэмакратычнай Расеі таксама будзе неабходна ўзмацніць супраціўленне хвалі “пасляімперскай настальгіі”.

На заканчэнне хацелася б адзначыць, што будучыя стасункі паміж Беларуссю і НАТА — гэта не проста фантазія, а магчымы і важны чыннік, які неабходна браць да ўвагі ў кантэксце дэмакратычных пераўтварэнняў у Беларусі і ўплыву такіх пераўтварэнняў на геапалітычны ландшафт Усходняй Еўропы. Незалежна ад таго, які шлях да дэмакратыі трэба прайсці Беларусі (адначасова з Расеяй або незалежна ад яе), прапанова аб уступленні ў НАТА будзе мець вызначальнае значэнне як для бяспекі дэмакратычнай Беларусі, так і для спрыяння стварэнню больш стабільнай і мірнай Еўропы, а таксама для дапамогі Расеі ў пераадоленні настальгіі аб імперскай мінуўшчыне.



***Андрус Кубілюс*** *– літоўскі палітык, сябра Еўрапейскага парламента (MEP). Ён займаў пасаду прэм'ер-міністра Літвы з 1999 да 2000 года і з 2008 да 2012 года.*

*У 1990 і 1992 годзе ён быў адказным сакратаром Руху за незалежнасць Саюдзіс і пазней Старшынёй Звязу Айчыны, літоўскіх хрысціянскіх дэмакратаў з 2003 да 2015 года. Быў дэпутатам Сэйма Літоўскай Рэспублікі з 1992 да 2019 года.*

*Андрус Кубілюс – кіраўнік групы EPP Літоўскай дэлегацыі ў Еўрапейскім парламенце, сустаршыня Парламенцкай асамблеі Еўранэст, сталы дакладчык Еўрапарламента аб Расеі, ініцыятар і старшыня розных міжпарламенцкіх форумаў у Еўрапейскім парламенце, такіх як глабальная сетка "Адзінства дзеля Украіны" (U4U), Форум Усходняга суседства ЕЗ і Сябры Расейскага еўрапейскага форума.*

# *ПОГЛЯД З ЛАТВІІ*

## *Ацэньваючы Беларусь з пункту гледжання рэгіянальнай бяспекі*

*Луізэ Ліцэ-Танэ*

За час з 24 лютага 2022 года геапалітычны ландшафт у Еўропе зазнаў значныя змены, бо краіны ў адказ на расейскую вайну супраць Украіны, вымушаныя былі пераацаніць свае абарончыя дактрыны ў сувязі са змененымі варункамі бяспекі. Праз тое, што Беларусь размешчаная паміж Расеяй і некалькімі краінамі Арганізацыі Паўночнаатлантычнага Альянсу (НАТА), роля Расеі ў падзеях, якія маюць месца ў Беларусі, яшчэ больш паўплывала на меркаванні рэгіянальнай бяспекі. Для таго, каб зразумець ролю Беларусі ў сістэме рэгіянальнай бяспекі, неабходна вывучыць пункт гледжання суседніх з ёй краін, з якіх Латвія ў гэтым артыкуле будзе прааналізаваная больш уважліва. З прычыны геапалітычнага размяшчэння балтыйскіх дзяржаў – Эстоніі, Латвіі і Літвы – на іх гістарычна зрабіла ўплыў палітыка суседзяў.

**У нашы дні, нягледзячы на тое, што яны геаграфічна параўнальна невялікія, краіны Балтыі маюць вялікую геапалітычную**

**важнасць і, як сябры НАТА, адыгрываюць істотную ролю ў абароне ўсходняга флангу НАТА. Такім чынам, канфлікты паміж краінамі Усходняй Еўропы і Расеяй, і параўнальна нядаўняя непрадказальнасць Беларусі, выклікаюць вялікую заклапочанасць краін Балтыі, і прывялі Латвію, у шмат якіх выпадках, да ўсведамлення ўразлівасці сваёй бяспекі.**

Прэзідэнцкія выбары 2020 у Беларусі, якія суправаджаліся шырокімі грамадзянскімі пратэстамі і гвалтам з боку дзяржавы, а таксама падзеі, якія былі следам за гэтым, дадалі трывогі краінам-суседзям Беларусі. Канкрэтнымі прыкладамі гэтага сталі прымусовая, справакаваная Беларуссю пасадка цывільнага самалёта, які ляцеў ў Вільню 23 траўня 2021, мігранцкі крызіс 2021 і расейская вайна 2022 супраць Украіны, узмоцненая тым фактам, што ўварванне Расеі ва Украіну часткова адбывалася з тэрыторыі Беларусі. Фактычна, увесну і ўлетку 2021 года Польшча, Латвія і Літва сутыкаліся з бесперапыннай плынню мігрантаў, якія рухаліся з Блізкага Усходу праз Беларусь і падштурхоўваліся да меж гэтых краін беларускім рэжымам. Аднак было хутка вызначана, што так званы гуманітарны крызіс быў створаны беларускім рэжымам і з’яўляўся адной з акцый гібрыднай вайны. Гэтыя дзеянні былі накіраваныя на мілітарызацыю праблемы мігрантаў з мэтай прасунуць беларускую палітычную тэматыку і дэстабілізаваць краіну-аб'ект і Еўрапейскі Звяз у цэлым.

Хаця мяжа Латвіі з Расеяй з'яўлялася важным чыннікам у ацэнцы яе бяспекі, крытыкі адзначылі неабходнасць далейшага ўзмацнення процідзеяння гібрыдным пагрозам і паляпшэння аховы мяжы з Беларуссю. Вышэйапісаныя падзеі сталіся прыкметай моцнага спаду ў стасунках паміж Латвіяй і Беларуссю, якія да 2020 маглі быць ахарактарызаваныя як прагматычныя.[1] Для ілюстрацыі (сказанага): замена мэрам Рыгі афіцыйнага сцяга Беларусі на бел-чырвона-белы сцяг апазіцыі падчас чэмпіянату свету ў хакеі прычынілася да таго, што абедзве краіны, Латвія і Беларусь, выслалі дыпламатаў адна адной[2], такім чынам прыпыніўшы дыпламатычныя стасункі.[3]

Больш за тое, улетку 2023 года на фоне працягу вайны Расеі ва Украіне ўзнікла новая пагроза бяспецы Польшчы, Латвіі ды Літвы ў сувязі з прысутнасцю ў Беларусі групы Вагнера — прыватнай вайсковай арганізацыі з блізкімі сувязямі з Расеяй.[4] І хоць пагроза не матэрыялізавалася, яна стала адлюстраваннем непрадказальнасці беларускага рэжыму. У выніку падзеі, якія разгортваюцца ў Беларусі, і вайскова-палітычнае супрацоўніцтва Расеі і Беларусі кідаюць выклік будучай рэгіянальнай стабільнасці і бяспецы. Пры гэтым супрацоўніцтва паміж Расеяй і Беларуссю дадало складанасці і ў стварэнні надзейнага чынніка стрымлівання для краін Балтыі ды іншых суседніх з імі дзяржаў-сябраў НАТА.

**Такім чынам, калі да 2020 года стасункі паміж Латвіяй і Беларуссю грунтаваліся на практычным супрацоўніцтве, то пасля**

**2020 года Беларусь стала пагрозай нацыянальнай і рэгіянальнай бяспецы Латвіі ды іншых суседніх краін.**

Акрамя таго, вайна Расеі супраць Украіны навочна паказала важнасць і сучасную актуальнасць НАТА і нагадала аб тых прычынах, праз якія альянс найперш і ствараўся. З моманту яго стварэння ў 1949 годзе ён адыгрываў важную ролю ў фармаванні ландшафту бяспекі Еўропы. І важна адзначыць, што НАТА як стрымальны чыннік і мера гарантыі на яе ўсходнім флангу падтрымлівала стабільнасць, а таксама значна змякчала неспакой Латвіі наконт бяспекі, асабліва пасля незаконнай анэксіі Крыма ў 2014.[5] Хоць Беларусь вяла дыялог і практычнае супрацоўніцтва з НАТА да 2021 года, калі яе сябры прыпынілі супрацоўніцтва з Беларуссю[6], яна не выказвала выяўнага намеру дамагацца сяброўства ў НАТА.

Больш за тое, абмеркаванне сяброўства Беларусі ў НАТА цяпер з'яўляецца гіпатэтычным. Аднак у выпадку пераходу Беларусі да дэмакратыі маецца на ўвазе, што гарантаваць сваю доўгатэрміновую бяспеку яна можа, толькі стаўшы сябрам НАТА.

**У той час як магчымае сяброўства Беларусі ў НАТА мела б складаныя і далёкасяжныя наступствы як дзяржавы-суседа краін-сябраў НАТА і ЕЗ, яе сяброўства ў НАТА магло б унесці станоўчы ўклад у еўраатлантычную бяспеку і спрыяць устойліваму міру ў Еўропе.**

Такім чынам, у кантэксце гэтага артыкула, варта разгледзець магчымыя выгады і праблемы ад патэнцыйнага сяброўства Беларусі ў НАТА з перспектывы бяспекі Латвіі.

Можна меркаваць, што патэнцыйнае сяброўства Беларусі ў НАТА магло б паспрыяць рэгіянальнай бяспецы і павялічыць супрацоўніцтва паміж суседнімі краінамі, усталяваўшы стасункі, грунтаваныя на агульных вартасцях дэмакратыі, правоў чалавека і літары закону. Яе сяброўства можа таксама стымуляваць супрацоўніцтва, каб супрацьстаяць гібрыдным пагрозам. У дадатак, яно магло б беспасярэдне ўмацаваць бяспеку Латвіі, засцярогшы Сувалкскі калідор. Ён злучае Літву і Польшчу, размешчаны паміж Расеяй (Калінінградская вобласць) і Беларуссю і з'яўляецца ўразлівым пунктам для бяспекі краін Балтыі.[7] Захоп Сувалкскага калідора мог бы адцяць адзіны наземны шлях для патэнцыйных падмацаванняў з боку НАТА і ізаляваць балтыйскія краіны ад астатняй тэрыторыі альянсу.

**Такім чынам, перспектыва далучэння Беларусі да НАТА, аб'яднаўшы рэгіён, патэнцыйна ўзмацніла б бяспеку Сувалскага калідора. Такім чынам, яе сяброўства ў НАТА ўмацавала б бяспеку суседніх з Беларуссю краін, стварыўшы дадатковую буферную зону супраць краін, якія кідаюць выклік рэгіянальнай бяспецы.**

Прынцыпова важна тое, што сяброўства Беларусі ў НАТА ўмацавала б стрымальны чыннік, павялічыўшы надзейнасць стрымлівання ў дачыненні да патэнцыйнага агрэсара, бо такое сяброўства дае доступ да механізмаў калектыўнай абароны, апісаных у Артыкуле 5 трактату НАТА, дзе заяўлена, што напад на аднаго сябра арганізацыі ўважаюць за напад на ўсіх. Можна меркаваць, што Расея не напала на тэрыторыю краіны-сябра НАТА праз рызыку ўводу ў дзеянне механізма калектыўнага дзеяння. Само сабой сяброўства ў НАТА дало б Беларусі гарантыі калектыўнай абароны і ў выніку стварыла б больш стабільныя стасункі паміж Беларуссю і Расеяй. У выпадку ўзброенага нападу сяброўства ў НАТА магло б дадаткова спрыяць бяспецы Латвіі і наадварот – з прычыны геаграфічнай блізкасці адна да адной. Такім чынам, краіны Балтыі, а таксама іншыя суседнія дзяржавы, атрымалі б выгаду ад мацнейшага механізму калектыўнай абароны і павелічэння захадаў стрымлівання ў рэгіёне.

З іншага боку, пры разглядзе стратэгічных стасункаў Беларусі і Расеі ды іх блізкіх гістарычных і культурных сувязяў, патэнцыйнае сяброўства можа абвастрыць напружанасць паміж дзвюма краінамі. І яна можа зрабіць пабочнае ўздзеянне на стасункі Расеі з НАТА і прычыніцца да эскалацыі напружанасці ў рэгіёне. Больш за тое, раз Расея можа ўспрыняць рух Беларусі да НАТА як пагрозу сваёй нацыянальнай бяспецы і інтарэсам бяспекі, яна можа адказаць сваімі контрзахадамі, каб дэстабілізаваць рэгіянальную бяспеку. Пры геаграфічнай блізкасці да Расеі і Бела-

русі, такое развіццё падзей наўпрост паўплывала б на нацыянальную бяспеку Латвіі. У выніку можна сцвярджаць, што самай значнай праблемай краіны-суседкі Расеі, якая імкнецца стаць сябрам НАТА, з'яўляецца заўсёдная апазіцыя Расеі павелічэнню НАТА паблізу ад яе меж.

**Разглядаючы шлях балтыйскіх краін да незалежнасці і дэмакратыі, Беларусь можа атрымаць каштоўную навуку ў дзяржаў Балтыі, якія далучыліся да НАТА ў 2004, нават нягледзячы на тое, што іх сяброўства ў альянсе ў той час здавалася малаімаверным.**

Пасля таго як краіны Балтыі зноў атрымалі незалежнасць у 1991, шлях да сяброўства ў НАТА быў спалучаны з перашкодамі, збольшага праз неабходнасць палітычных, вайсковых ды інстытуцыйных рэформаў, каб адпавядаць крытэрам сяброўства ў НАТА. Аднак, хоць Расея ў той час выказвала сваю апазіцыю павелічэнню НАТА каля сваіх меж, сама яна была падзеленая і занадта занятая сваімі ўнутранымі клопатамі, каб кінуць рэальны выклік далучэнню балтыйскіх краін да НАТА. Такім чынам, улічваючы бягучае геапалітычнае асяроддзе, уступленне Беларусі ў НАТА малаімавернае, пакуль Беларусь і Расея не зменяць курс.

**Важнае тое, што спрыянне, якое робіцца паўночнымі суседзямі дзяржаў Балтыі ды**

**скандынаўскімі краінамі пасля таго, як балтыйскія краіны зноў атрымалі незалежнасць і ў выніку ўтворанага партнёрства паміж краінамі, праклала шлях уступленню ў НАТА і ЕЗ для балтыйскіх краін.**

Аналагічна, беручы да ўвагі нязменную падтрымку з боку краін Балтыі беларускага грамадства, яго намаганняў для дасягнення свабоды і дэмакратыі і пры пераходзе да дэмакратыі, Беларусь можа разглядаць зварот да сваіх беспасярэдніх суседзяў, балтыйскіх краін, па дапамогу. На гэты момант будучыня дэмакратычнай Беларусі залежыць ад настойлівасці беларускага грамадства ў яго спробах прасоўваць пераход да дэмакратыі.

Акрамя таго, падрыхтоўчыя дзеянні для інтэграцыі ў НАТА маюць выконвацца ў межах існых магчымасцяў.

---

1. Міністэрства замежных спраў Латвіі, "Двустароннія стасункі Латвійскай Рэспублікі і Рэспублікі Беларусь", 28 ліпеня 2022, https://www.mfa.gov.lv/arpolitika/divpusejas-attiecibas/latvijas-un-baltkrievijas

2. "Беларусь і Латвія ўзаемна высылаюць дыпламатаў", 24 траўня 2021, https://eng.lsm.lv/article/ tit-for-tat-move.a406011

3. Для дадатковай інфармацыі аб перспектыве з Латвіі глядзі Э.Д'ятковіца, "Перспектыва з Латвіі: Ад лагоды да турботы" у (зборніку аўтараў) Марыс Андзанс ды іншыя, "Беларусь пасля 2020: Наступствы ў бяспецы і абароне для балтыйскіх дзяржаў, Польшчы і НАТА", Латвійскі інстытут міжнародных стасункаў, 2021, старонкі 15-22, https://

www.liia.lv/en/publications/post-2020-belarus-security-and-defence-implications-for-the-baltic -states-poland-and-nato-949

4. Гхаедзі М., "Кім ёсць расейская арганізацыя наймітаў група Вагнера?" Deutsche Welle, 27 чэрвеня 2023, https://www.dw.com/en/who-are-russias-mercenary-wagner-group/a -6442938

5. НАТА, "Стасункі з Расеяй", 3 жніўня 2023, https://www.nato.int/cps/en/natohq/topics_50090.htm

6. НАТА, "Стасункі з Беларуссю", 22 ліпеня 2022, https://www.nato.int/cps/en/natohq/topics_49119.htm

7. Сытас А., "Вайсковыя вучэнні НАТА ўпершыню абараняюць уразлівае месца Балтыі", Reuters, 18 чэрвеня 2017. https://www.reuters.com/article/us-nato-russia-suwalki-gap/nato-war- game-defends-baltic-weak-spot-for-first-time-idUSKBN1990L.2



*__Луізэ Ліцэ-Танэ__ – малодшая навуковая супрацоўніца Цэнтра геапалітычных даследаванняў, Рыга. Яна мае ступені бакалаўра палітычнага* *паліталогіі ды магістра міжнародных стасункаў і дыпламатыі. Ейныя даследчыя інтарэсы ўключаюць бяспеку і абарону краін Балтыі, стратэгію стрымлівання, бяспеку Арктыкі і аналіз узброеных канфліктаў.*

# *ПОГЛЯД З ЭСТОНІІ*

## *Тыраны не баяцца нейтралітэту*

***Сільвэр Лойт***

Працяг вайна Расеі супраць Украіны выклікаў значныя змены сітуацыі з бяспекай у Балтыйскім рэгіёне. Сяброўства Фінляндыі ў НАТА і заява Швецыі аб уступленні ў НАТА, якая рана або позна будзе задаволеная, умацавалі бяспеку Балтыйскага рэгіёна і падвысілі яго здольнасць супраціўляцца адзінай небяспечнай і патэнцыйна разбуральнай сіле ў рэгіёне – Расеі. І ўсё гэта адбылося нягледзячы на тое, што Расея выставіла жорсткі ультыматум НАТА, ЗША і АБСЕ 17 снежня 2021 года, спрабуючы зноў навязаць Захаду расейскія правілы гульні. Зверская вайна Расеі супраць Украіны мела супрацьлеглы эфект, што пацвердзіў прэзідэнт Фінляндыі Саўлі Нііністэ, які звярнуўся да Уладзіміра Пуціна са словамі: "Паглядзіце ў люстра, Вы самі да гэтага прычыніліся". Гэта вельмі сімвалічна і драматычна. Гэта пазначыла канец працяглага фінскага нейтралітэту і, нарэшце, загарнула раздзел двухсотгадовой палітыкі нейтралітэту ў рэгіёне.

**Палітыка нейтралітэту ўжо даўно выявіла сваю слабасць на прыкладзе Эстоніі.**

**Цвёрдая падтрымка НАТА з боку Эстоніі будуецца на трагічнай мінуўшчыні краіны.**

На самым пачатку, калі Эстонія набыла незалежнасць, канцэпцыя палітыкі нейтралітэту здавалася цалкам прыдатнай для зноў утворанай дзяржавы, якая зазнала ўвесь цяжар Першай сусветнай вайны. У “Маніфесце ўсім народам Эстоніі”, Дэкларацыі незалежнай Эстонскай Рэспублікі, абвешчаным 24 лютага 1918 года ў Таліне, ясна адзначаецца, што “Эстонская Рэспубліка жадае захоўваць абсалютны палітычны нейтралітэт у дачыненні да ўсіх суседніх дзяржаў і народаў і чакае, што яны гэтак жа адкажуць поўным нейтралітэтам”. Імкненне да нейтралітэту было даволі практычным развязаннем: дзясяткі тысяч эстонцаў былі на палях бітваў Першай сусветнай вайны ў шэрагах расейскага войска. Заснавальнікі незалежнай Эстоніі не хацелі прымаць чый-небудзь бок ў ваенных сутыкненнях паміж руйнаванымі імперыямі.

Эстонія была вымушана адмовіцца ад ідэі поўнага нейтралітэту ўжо ў першыя дні набыцця незалежнасці. Талін быў акупаваны войскамі імперскай Нямеччыны ўжо на другі дзень пасля абвяшчэння незалежнасці Эстоніі. Нямеччына пацярпела паразу ў Сусветнай вайне, і Эстонія зазнала напад Савецкай Расеі і Прыбалтыйскага ландэсвера.

Эстонія перамагла ў вайне за незалежнасць (1918-1920). Хаўруснікі - Вялікая Брытанія, Фінляндыя, Латвія, ахвотнікі з Швецыі, Даніі, частка балтыйскіх немцаў і частка расейскай "Белай гвардыі" – падтрымалі Эстонію. Такім чынам, досвед Эстоніі ў вайне за

незалежнасць прадэманстраваў, што краіна мае патрэбу ў надзейных хаўрусніках, і гэтая патрэба абвастрылася, калі Эстонія хадайнічала аб паўнавартасным дыпламатычным прызнанні міжнароднай супольнасці, асабліва ад сябраў Антанты. Савецкая Расея была першай дзяржавай, якая прызнала Эстонію дэ-юрэ ў адпаведнасці з Тартускім мірным трактатам, падпісаным прадстаўнікамі ўрадаў краін 2 лютага 1920 года. Расея безумоўна прызнала "незалежнасць і самастойнасць Эстонскай Дзяржавы" і адмовілася "самахоць і на вечныя часы ад усялякіх суверэнных правоў, якія належалі Расеі ў дачыненні да эстонскага народа і зямлі з прычыны раней існага дзяржаўнаправавога парадку, а таксама на падставе міжнародных пагадненняў, якія трацяць дзеянне на будучыя часы" (артыкул 2). Савецкая старана абяцала, што "на выпадак міжнароднага прызнання сталага нейтралітэту Эстоніі Расея са сваёй стараны абавязваецца выконваць гэты нейтралітэт і браць удзел у гарантыі захавання такога нейтралітэту" (артыкул 5). Што да павелічэння бяспекі Балтыйскага мора, абедзве дамоўныя стораны пагадзіліся, што "абавязваюцца далучыцца ў выпадку міжнароднай нейтралізацыі Фінскай затокі да гэтай нейтралізацыі на ўмовах, выпрацаваных пры ўдзеле ўсіх зацікаўленых дзяржаў і ўстаноўленых дзейнымі міжнароднымі актамі; а таксама, у выпадку, калі гэта згаданым міжнародным пагадненнем будзе ўстаноўлена, прывесці свае вайскова-марскія сілы або частку іх у стан, які адпавядае патрабаванням названага міжнароднага пагаднення" (артыкул 6). Стораны дамовіліся заба-

раніць усякія тыпы вербавання і мабілізацыі якіх-небудзь войскаў, якія ставяць за мэту ўзброеную барацьбу з другой дамоўнай стараной (артыкул 6).[1] Такія мірныя пагадненні паміж Саветамі і Літвой (Масква, 12 ліпеня 1920), Латвіяй (Рыга, 11 жніўня 1920), Фінляндыяй (Тарту, 14 кастрычніка 1920) і Польшчай (Рыга, 18 сакавіка 1921) далі пэўную надзею на мір і стабільнасць у рэгіёне. Аднак гэта трывала нядоўга: у першыя гады пасля заканчэння грамадзянскай вайны Савецкая Расея здалела стабілізаваць сітуацыю ўнутры дзяржавы шляхам хлуслівых абяцанняў і праз тэрор супраць свайго ўласнага насельніцтва, а таксама супраць насельніцтва анэксаваных краін. Камуністычная Расея прадэманстравала свае рэваншысцкія мэты, акупаваўшы і анэксаваўшы іншыя зноў утвораныя незалежныя дзяржавы, такія як Беларусь, Украіна, Арменія, Азербайджан і Грузія. Акрамя таго, Расея ініцыявала камуністычную гібрыдную вайну і кампаніі дэзінфармацыі супраць сваіх суседзяў, у тым ліку Эстоніі.

1 снежня 1924 года Савецкі Саюз паспрабаваў зрынуць дэмакратычна абраны ўрад Эстоніі, ініцыяваўшы ўзброены пераварот у Таліне. Гэтая спроба скончылася крахам, але яна яшчэ раз прадэманстравала неабходнасць надзейнага альянсу або, прынамсі, больш шчыльнага супрацоўніцтва ў галіне бяспекі паміж дзяржавамі-аднадумцамі.

На пачатку 1920-х гадоў Эстонія спрабавала атрымаць гарантыі падтрымкі ад Злучанага Каралеўства, якое дапамагала ёй у самыя цяжкія дні вайны за незалежнасць у канцы 1918 года. Пад 1925 год

стала ясна, што Злучанае Каралеўства прыняло б за лепшае дыстанцыявацца ад спраў Балтыйскіх краін. Ангельска-нямецкае марское пагадненне, падпісанае 18 чэрвеня 1935 года, яшчэ больш абмежавала прысутнасць Брытаніі ды ўзмацніла непажаданую прысутнасць Нямеччыны ў Балтыйскім моры. Але Вялікая Брытанія і Францыя як падмуркавыя камяні Вэрсальскай сістэмы заставаліся як палітычна, так і культурна важнымі чыннікамі замежнай палітыкі Эстоніі.

**Здавалася цалкам натуральным інвеставаць у супрацоўніцтва паміж суседзяміаднадумцамі. У першай палове 1920-х гадоў Эстонія была ініцыяторкай і актыўна падтрымлівала іншыя ініцыятывы супрацоўніцтва ў галіне рэгіянальнай бяспекі паміж Фінляндыяй, Эстоніяй, Латвіяй, Літвой і Польшчай.**

Мэтай Балтыйскіх канферэнцый было дасягненне больш шчыльнай каардынацыі замежнай палітыкі дзяржаў, якія сутыкнуліся з агульнай пагрозай ад Савецкага Саюза і асцерагаліся росту ўплыву рэваншысцкіх сіл, насоўвання віхуры ў дэмакратычнай Ваймарскай рэспубліцы. На жаль, вайна і спыненне дыпламатычных стасункаў паміж Польшчай і Літвой пахіснулі перспектывы больш шчыльнага супрацоўніцтва ў Балтыйскім рэгіёне. Фінляндыя ў цэлым успрымалася як балтыйская дзяржава, але яна пачала дыстанцыявацца ад балтыйскіх праблем і рабіла (спачатку вельмі бясплённыя) спробы далучыцца да супрацоўніцтва традыцыйна нейтральных краін

Паўночнай Еўропы. Ідэя стварэння шырокай "Лігі Балтыйскай абароны" зазнала крах і толькі часткова матэрыялізавалася ў двустароннім абаронным пагадненні паміж Латвіяй і Эстоніяй ад 1 лістапада 1923 года. Гэты альянс абавязаў абедзве дзяржавы даць неадкладную двустароннюю дапамогу ў выпадку неспраувакаванай агрэсіі. Стварыць такі звяз не выпала, але гэта не касуе таго факта, што адзіным рэальным вайсковым хаўруснікам Эстоніі паміж дзвюма сусветнымі войнамі была Латвія, блізкі сусед, з вельмі падобным негатыўным гістарычным досведам: тры стагоддзі сярэднявечнай інфлянцкай дзяржаўнасці, за якой было кіраванне Польшчы, Швецыі і Расеі. Праз адзінаццаць гадоў у Жэнэве Эстонія, Латвія і Літва падпісалі “Пакт аб супрацоўніцтве, згодзе і ўзаемнай дапамозе” ад 12 верасня 1934 года. Мэтай Пакта было правядзенне супольнай замежнай палітыкі.

Гэты звяз таксама стаў вядомы як "Балтыйская Антанта", але ён не валодаў дастатковай практычнай значнасцю, бо ўспрыманне пагроз старанамі адрознівалася: Эстонія і Латвія бачылі ў Савецкім Саюзе галоўную пагрозу сваёй незалежнасці і падтрымлівалі прыязныя стасункі з Польшчай, у той час як Літва ўважала Польшчу і Нямеччыну за ключавыя пагрозы свайму існаванню. Тым не менш, нават сімвалічнае "Балтыйскае адзінства" паміж Эстоніяй, Латвіяй і Літвой заклала трывалы падмурак як для шчыльнага супрацоўніцтва паміж іх дыпламатычнымі карпусамі, так і для супольных дзеянняў аб'яднанняў нацыянальных меншасцяў гэтых краін на Захадзе падчас савецкай акупацыі.

У першыя гады пасля Першай сусветнай вайны існавала пэўнае спадзяванне на дзейснасць мірных ініцыятыў Лігі Нацый. Гэтае спадзяванне выявілася марным, бо асобныя вялікія дзяржавы не ўступілі ў звяз, а таталітарныя рэжымы ў Савецкім Саюзе, Італіі, Нямеччыне і Японіі відавочна ігнаравалі прынцыпы калектыўнай бяспекі і раззбраення. У выніку ўнутранага крызісу, выкліканага Вялікай дэпрэсіяй у 1934 годзе, Эстонія стала на аўтарытарны шлях, што адштурхнула паасобных прыяцеляў Эстоніі сярод дэмакратычных краін Паўночнай Еўропы. Нават пры параўнальна мяккім аўтарытарным кіраванні Канстанціна Пятса (1934–1940), у так званую "Эпоху маўчання", Эстонія заставалася бяспечным сховішчам для нацыянальных этнічных і рэлігійных меншасцяў, якія захоўвалі істотную культурную аўтаномію. У Эстоніі былі цалкам забаронены фашыстоўскія, нацысцкія і камуністычныя арганізацыі. У 1934 годзе, праз год пасля прыходу да ўлады нацыстаў у Нямеччыне, у Тартускім універсітэце быў адкрыты факультэт юдаікі. У 1936 годзе ўплывовы лонданскі штотыднёвік “The Jewish Chronicle” (“Габрэйскія хронікі”) назваў Эстонію “аазісам талерантнасці”.

Нацысты захапілі Аўстрыю і Чэхаславаччыну, і двустароннія пагадненні аб ненападзе (з Савецкім Саюзам 4 траўня 1932 года і з нацысцкай Нямеччынай 7 чэрвеня 1939 года), як і палітыка нейтралітэту, здаваліся астатняй надзеяй на захаванне гэтага "аазіса". Эстонія, Латвія і Літва прыйшлі да дамоўленасці аб прыняцці агульнага для трох краін закона аб нейтралітэце на Канферэнцыі міністраў замежных

спраў Балтыі 18 лістапада 1938 года ў Рызе. Парламент Эстоніі ратыфікаваў гэты закон 1 снежня 1938 года. "Закон аб нейтралітэце Эстоніі" быў прыняты паводле прыкладу Дэкларацыі Швецыі "Аб нейтралітэце" ад 29 траўня 1938 года. Эстонія заявіла аб сваім строгім нейтралітэце ў першы дзень Другой сусветнай вайны, як і іншыя краіны Паўночнай Еўропы і Балтыі. Кіраўніцтва Эстоніі спадзявалася, што асцярожнае балансаванне паміж Савецкім Саюзам і Нямеччынай сапраўды забяспечыць незалежнасць Эстоніі.

Аднак нацысцкая Нямеччына і Савецкі Саюз вызначылі лёс Эстоніі, таксама як і Фінляндыі, Латвіі, Літвы, Польшчы і Румыніі, падпісаўшы пакт ад 23 жніўня 1939 года і дадатковыя сакрэтныя пратаколы да яго. Савецкі Саюз, застаючыся фармальна нейтральнай краінай, уварваўся ў Польшчу і вымусіў Эстонію (28 верасня 1939 года), Латвію (5 кастрычніка 1939) і Літву (10 кастрычніка 1939) падпісаць пагадненні аб савецкіх вайсковых базах на тэрыторыі гэтых краін. Пасля супольнага нацысцка-савецкага нападу і разбурэння Польшчы, якая з'яўлялася адной з ключавых дзяржаў у рэгіёне, падавалася, што няма ніякіх шанцаў на паспяховае ўзброенае супраціўленне. Эстонія і суседнія краіны Балтыі далей падкрэслівалі свой нейтралітэт, пакуль доўжылася вайна, падпарадкоўваючыся ўсё большым патрабаванням Савецкага Саюза. Фінляндыя ж супраціўлялася Савецкаму Саюзу, адмаўляючыся выконваць гэтыя патрабаванні. У часе Зімовай вайны (з 30 лістапада 1939 года да 12 сакавіка 1940 года) Вайскова-паветраныя сілы Савец-

кага Саюза выкарыстоўвалі свае базы, размешчаныя на тэрыторыі нейтральнай Эстоніі, для бамбавання Хельсінкі ды іншых частак Фінляндыі. Усе выдатна разумелі, што савецкія бамбавікі ўзлятаюць з аэрадромаў, размешчаных на тэрыторыі акупаванай Эстоніі, і парушаюць паветраную прастору Фінляндыі, аднак улады Эстоніі афіцыйна адмаўлялі гэты факт, як і парушэнне Савецкім Саюзам нейтралітэту Эстоніі. У той жа час вайсковая выведка Эстоніі інфармавала фінаў аб атаках савецкіх бамбавікоў і дапамагала Фінляндыі падрыхтавацца да нападаў. Насельніцтва Эстоніі аднадушна падтрымала Фінляндыю ў вайне супраць савецкіх захопнікаў, а эстонскія ахвотнікі ўступалі ў шэрагі фінскага войска.

**Гісторыя паўтараецца: Расея напала на Украіну з тэрыторыі суседняй Беларусі ў лютым 2022 года. Але, на адрозненне ад Эстоніі ў 1939-1940 гадах, беларускія ўлады ахвотна падтрымлівалі сваіх расейскіх хаўруснікаў, напрыклад, даючы лагістычную падтрымку. Ніхто не пытаўся ў народа Эстоніі ў 1939-1940 гадах, таксама як ніхто не пытаўся ў народа Беларусі ў 2022 годзе. Тым не менш, Крэмль меў аднолькавыя мэты: пасварыць эстонцаў з фінамі раней, і пасварыць беларусаў з украінцамі цяпер. *Divide et impera*.**

Таемнае супрацоўніцтва выведак Эстоніі і Фінляндыі падчас Зімовай вайны з Савецкім Саюзам

не змяніла таго факта, што нейтралітэт і незалежнасць Эстоніі сталі проста ілюзіяй. Збольшага Эстонія не стала выняткам: у красавіку 1940 года Нямеччына ўварвалася ў нейтральную Данію і нейтральную Нарвегію. Толькі Швецыя змагла ўнікнуць парушэння свайго нейтралітэту, які ёй выпадала захоўваць на працягу доўгага часу падчас Другой сусветнай вайны, аднак толькі цаной шматлікіх абмежаванняў.

Савецкі Саюз зрынуў урады Эстоніі, Латвіі і Літвы ды анэксаваў гэтыя краіны ў жніўні 1940 года, пакуль Францыя знаходзілася пад акупацыяй Нямеччыны з чэрвеня 1940 года. Крэмль жа, сярод іншага, абвінаваціў вельмі асцярожныя, нейтральныя і лаяльныя ўрады Эстоніі, Латвіі і Літвы ў тым, што яны не былі дастаткова нейтральнымі. Крэмль заўсёды лёгка знаходзіў "довады" для хлуслівых абвінавачанняў: адным з ключавых абвінавачванняў Савецкага Саюза на адрас нейтральных краін Балтыі было існаванне вышэйзгаданай злашчаснай "Балтыйскай Антанты", якая ніколі не мела вайсковай накіраванасці і ніколі раней не прываблівала ўвагі Крамля. Напраўду "Балтыйская Антанта" была толькі платформай для перамоў трох нейтральных дзяржаў, а не падставай для змоў супраць каго-небудзь.

Пастанова краін Балтыі скасаваць усё супрацоўніцтва і не чыніць узброенага супраціўлення для абароны незалежнасці не дапамагла ўнікнуць абвінавачанняў з боку Крамля і не пазбавіла іх ад палітыкі тэрору, накіраванай супраць іх народаў. У 1941 годзе прыйшла нямецкая акупацыя, якая доўжылася да 1944 года, а затым яна змянілася акупацыяй

савецкай (1944-1991). Дэмакратычныя краіны Захаду асудзілі акупацыю трох краін Балтыі, адмовіліся прызнаць іх анэксію і далей прызнавалі дыпламатычныя прадстаўніцтвы і пашпарты грамадзян краін Балтыі. Але яны не змаглі ўнікнуць зверстваў нацыстаў і СССР на тэрыторыі акупаваных дзяржаў: масавыя забойствы і дэпартацыі, Галакост, канфіскацыя ўласнасці, рэпрэсіі супраць інтэлектуальных і палітычных эліт, вялізная шкода навакольнаму асяроддзю, агрэсіўныя кампаніі саветызацыі і русіфікацыі.

Крах палітыкі нейтралітэту і страта незалежнасці сталі прычынай таго, што прадстаўнікі краін Балтыі ў вольным свеце адразу ж з энтузіязмам успрынялі стварэнне НАТА 4 красавіка 1949 года. У той жа дзень выканаўца абавязкаў генеральнага консула Эстоніі Ёганэс Кайв адправіў паведамленне дзяржаўнаму сакратару ЗША Дыну Ачасану аб тым, што Эстонія незаконна акупаваная і знаходзіцца пад прыгнётам Савецкага Саюза, "не атрымала магчымасці выявіць сваю вялікую цікавасць да гэтага пагаднення".[2] Аналагічныя заявы зрабілі дыпламаты Латвіі ды Літвы. Важнасць трансатлантычнага вайсковага супрацоўніцтва і гарантый бяспекі пасля Другой сусветнай вайны дакладна ўсведамлялі Данія і Нарвегія, нейтралітэт якіх быў парушаны падчас вайны і якія ўвайшлі ў склад дзяржаў-заснавальніц НАТА.

**Разуменне таго, што НАТА будзе адзінай магутнай і вартай даверу сілай, якая будзе даваць гарантыі бяспекі перад абліччам савецка-расейскай тыраніі, падзялялі**

**шмат хто ў акупаванай Эстоніі, у тым ліку маладое пакаленне эстонскіх студэнтаў, якія падчас уладарання Брэжнева нават прысвяцілі НАТА песню. Адзін са студэнтаў — Март Лаар — стаў прэм'ер-міністрам пасля аднаўлення незалежнасці Эстоніі ды заклаў падмурак для ўступлення Эстоніі ў ЕЗ і НАТА.**

Дэбаты аб палітыцы бяспекі краін Балтыі, якія пачаліся пасля аднаўлення дзяржаўнасці, пакідалі мала магчымасцяў для захавання нейтралітэту — быў навочны і сумны гістарычны досвед. Эстонія, Латвія і Літва змаглі ўмацаваць існы кансэнсус у дачыненні да НАТА пасля вываду рэштак былых савецкіх войскаў з краін Балтыі ў 1994 годзе. Выдатная дыпламатыя і падтрымка краін-аднадумцаў далі добрыя вынікі, і яны закончылі працэс уступлення ў НАТА і ЕЗ праз дзесяць гадоў. Гэтае дзесяцігоддзе было патрэбнае для структурных змен і дэмакратызацыі грамадства. Ніхто не змог падаць сур'ёзных аргументаў на карысць нейтралітэту краін Балтыі. Расея ж, у сваю чаргу, аднавіла рэалізацыю сваіх імперыялістычных планаў.

29 сакавіка 2024 года Эстонія, Латвія і Літва разам з Балгарыяй, Румыніяй, Славаччынай і Славеніяй адзначаюць сваё 20-годдзе як дзяржавы-сябры НАТА. Гісторыя савецка-нацысцкага супрацоўніцтва, "Халоднай вайны" і яе працягу пасля руйнавання Берлінскага муру давяла, што нейтралітэт у Еўропе — гэта ілюзія, якая можа існаваць толькі ў

суседстве з квітучымі і прадказальнымі дзяржавамі-сябрамі НАТА і за іх кошт.

Устойлівае грамадства, моцнае войска і актыўнае сяброўства ў НАТА — гэта адзіная альтэрнатыва для таго, хто хоча заставацца вольным у небяспечным суседстве з Расеяй і трымацца далей ад яе разбуральнага ўплыву.

---

1. Мірны трактат паміж Расеяй і Эстоніяй, 2 лютага 1920 года, Тарту. Зборнік пагадненняў Лігі Нацый. http://www.worldlii.org/int/other/LNTSer/1922/92.html
(дата звароту: 20.09.2023).

2. https://estonianworld.com/security/the-74-year-old-letter-that-indicates-estonia-wanted-to-be-a-nato-founding-member/ (дата звароту: 20.09.2023).



***Сільвэр Лойт** – вывучаў гісторыю ў Тартускім універсітэце і Ягелонскім універсітэце ў Кракаве, дактарант-даследчык у галіне эстонскай дыпламатыі, эстонска-польскіх стасункаў і дыпламатычнага пратакола ў Эстоніі паміж дзвюма сусветнымі войнамі.*

*На дыпламатычнай службе Эстоніі працуе з 2007 года. У 2010-2013 і 2019-2021 гадах працаваў у Амбасадзе Эстоніі ў Расеі, займаючыся пытаннямі расейскай унутранай палітыкі і правоў чалавека, у 2013-2016 — намеснік кіраўніка місіі, консул у Амбасадзе Эстоніі ў Ізраілі. З 2021 года працуе ў эстонскім цэнтры міжнароднага развіцця.*

# *ПОГЛЯД З ФІНЛЯНДЫІ*

## *Шлях Фінляндыі ў НАТА*

***Кары Люхто***

Шлях Фінляндыі ў НАТА значна даўжэйшы за рэальны працэс інтэграцыі нашай краіны ў альянс, таму прапаную вам сціслы гістарычны агляд паслядоўнасці гэтых падзей.

Савецкі Саюз не здолеў акупаваць Фінляндыю на працягу Другой сусветнай вайны, а пасля яе заканчэння Фінляндыя, насуперак прыкладу краін Балтыі, не стала часткай Савецкага Саюза. Але хоць яна і не была акупаваная, Фінляндыя заставалася ў сферы савецкіх інтарэсаў, у сувязі з чым нашай краіне, праз ціск СССР, давялося адмовіцца, акрамя ўсяго іншага, ад плана Маршала, прапанаванага ЗША.

**Базай стасункаў паміж Фінляндыяй і Савецкім Саюзам стала Пагадненне аб сяброўстве, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе, або ЮЮА-Пагадненне, як яго называюць фіны. Яно таксама ўключала тэзіс аб палітыцы ў галіне бяспекі: Савецкаму Саюзу давалася магчымасць вайсковых кансультацый, калі б Фінляндыя паспрабавала выйсці са сферы савецкіх**

**інтарэсаў. Падчас Вугорскага паўстання ў 1956 годзе і Пражскай Вясны ў 1968 годзе Фінляндыя была вельмі занепакоена тым, што хваляванні ў краінах-сатэлітах Савецкага Саюза ва Усходняй Еўропе могуць справакаваць жаданне Крамля пачаць вайсковыя кансультацыі з Фінляндыяй.**

У дадатак да ЮЮА-Пагаднення СССР шукаў шляхі ўзмацнення залежнасці Фінляндыі ад Савецкага Саюза, падтрымліваючы, да прыкладу, кар'ернае развіццё ў Фінляндыі прасавецкіх палітыкаў і павялічваючы эканамічную залежнасць Фінляндыі ад Савецкага Саюза. Фінляндыя не была сябрам РЭУ (Рады эканамічнай узаемадапамогі) сацыялістычных дзяржаў, таму Савецкі Саюз імкнуўся павысіць залежнасць Фінляндыі, стварыўшы сістэму клірынгавых выплат праз пяць гадоў пасля Другой сусветнай вайны. Клірынгавы гандаль паміж Фінляндыяй і Савецкім Саюзам грунтаваўся на абмене таварамі без выкарыстання канверсоўных валют, пільную нястачу якіх зазнаваў СССР.

Падчас міжнароднага нафтавага крызісу ў 1983 годзе доля СССР у замежным гандлі Фінляндыі была самай высокай, складаючы яе чвэрць. Савецкі Саюз спрабаваў павялічыць залежнасць Фінляндыі, асабліва ў энэргазабеспячэнні. І напраўду, на яго прыпадала львіная доля фінскага імпарту энэрганосьбітаў.

Сама ж Фінляндыя дзейнічала так, каб савецкія мэты не былі дасягнутыя, і каб яна не патрапіла пад

поўны кантроль Крамля. У 1956-1982 гадах прэзідэнтам краіны быў Урха Кеканэн. Ён з'яўляўся былым супрацоўнікам Etsiva Keskuspoliisi, таемнай паліцыі Фінляндыі, і ў якасці прэзідэнта краіны ўзяў кіраванне стасункаў з Савецкім Саюзам пад свой уласны кантроль, а таксама вызначыў, што аднымі з асноўных задач таемнай паліцыі з'яўляецца маніторынг і абмежаванне распаўсюджвання камунізму ў Фінляндыі.

Здалёку, магчыма, здавалася, што Фінляндыя зазнавала так званую "фінляндызацыю" і што Кеканэнам кіраваў Крэмль, але напраўду, маючы шчыльныя стасункі з Крамлём, ён імкнуўся падштурхоўваць Фінляндыю да Захаду з дапамогай супрацоўніцтва з Еўропай ды іншымі скандынаўскімі краінамі (сяброўства ў Паўночнай Радзе ў 1955 годзе, асацыяванае сяброўства ў Еўрапейскай асацыяцыі вольнага гандлю ў 1960 і поўнае сяброўства ў 1985 і пагадненне аб вольным гандлі з Еўрапейскай эканамічнай супольнасцю ў 1973 годзе) і шляхам умацавання аўтарытэту Фінляндыі на міжнароднай арэне, да прыкладу, пад эгідай Нарады аб бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (НБСЕ) ў 1970-х. Аналагічна, каб прадухіліць ператварэнне Фінляндыі ў яшчэ больш залежную ад энэрганосьбітаў краіну, было абмежаванае выкарыстанне газу ў хатніх гаспадарках, а значная частка перапрацаванай савецкай сырой нафты ішла на экспарт. І хоць Фінляндыя спрабавала перашкаджаць росту ўплыву Савецкага Саюза на паводзіны краіны, СССР набыў дастаткова моцны кантроль над

палітычнай і эканамічнай элітамі Фінляндыі. Аднак Савецкі Саюз не здабыў поспеху ва ўплыве на кадравыя прызначэнні ў фінскіх сілах абароны і таемнай паліцыі. Выняткам з гэтага стаў перыяд, калі камуністы кіравалі таемнай паліцыяй у 1945-1948 гадах. Так званая Red Valpo (Чырвоная дзяржаўная паліцыя) была распушчаная ў 1949 годзе, і яе пераемнікам стала цяпер дзейная таемная паліцыя, Фінская служба бяспекі і выведкі (Suopo, а пазней Supo).[1]

Сітуацыя моцна змянілася на пачатку 1990-х. Клірынгавы гандаль паміж Фінляндыяй і Савецкім Саюзам нечакана закончыўся пад канец 1990 года, а годам пазней СССР быў распушчаны. Не раскідаўшыся, Савецкі Саюз, імаверна далей бы інтэграваў у сябе Фінляндыю палітычна і эканамічна, а апошняя, у сваю чаргу, рабіла б усё магчымае, каб абараніць сябе ад абдымкаў Крамля, якія б аслабілі нашу незалежнасць. Аднак раскіданне СССР змяніла сітуацыю. Пільнае вока Расеі аслабела, і Фінляндыя рушыла на Захад, да якога яна заўсёды належала культурна і гістарычна.

У 1992 годзе YYA-Пагадненне было скасаванае з узаемнай згоды Фінляндыі і Расеі. У тым жа годзе Фінляндыя далучылася да зноў утворанай Рады паўночнаатлантычнага супрацоўніцтва (РПАС). Яшчэ адным значным крокам стаў закуп на Захадзе тэхнікі для фінскіх сіл абароны, напрыклад, пастанова набыць у 1992 годзе знішчальнікі F-18 Hornet. Праз два гады Фінляндыя падпісала пагадненне з НАТА “Партнёрства дзеля міру”. Яна далучылася да Еўра-

пейскага Звязу ў 1995 годзе, адначасова з Аўстрыяй і Швецыяй.

**Упершыню ў 1999 годзе ў фінскую ўрадавую праграму, у раздзел замежнай палітыкі і бяспекі, было ўключанае супрацоўніцтва з НАТА. Такое супрацоўніцтва прыняло наступныя формы: "Партнёрства дзеля міру", супрацоўніцтва ў галіне вайсковых вучэнняў, і дастасаванне фінскіх сіл абароны да стандартаў НАТА.**

У 2007 годзе ва ўрадавую праграму Фінляндыі быў упершыню ўключаны тэзіс аб магчымым сяброўстве ў НАТА. Такая ж магчымасць стала часткай і наступных праграм урада. Фінляндыя далучылася да сіл хуткага рэагавання НАТА ў 2008 годзе, а ў 2014 падпісала з НАТА "пагадненне з прыймовай краінай", мэтай якіх стала спрыянне практычнаму супрацоўніцтву Фінляндыі і НАТА.

З 2015 года Фінляндыя ўдзельнічала, напрыклад, у аперацыі ў Афганістане, якую ўзначальвае НАТА. Але яшчэ важней, што фінскія сілы абароны пачалі перабудоўваць тэхніку і метады вядзення баявых аперацый для адпаведнасці стандартам НАТА. Без перабольшання можна сцвярджаць, што нават да ўваходжання Фінляндыі ў НАТА фінскія сілы абароны больш адпавядалі стандартам НАТА, чым узброеныя сілы паасобных краін, якія датуль ужо былі ўдзельнікамі альянсу.

**Можа прагучаць іранічна, але бясспрэчным з'яўляецца той факт, што Фінляндыя ў выніку прыйшла ў НАТА не дзякуючы дзеянням палітычнай эліты краіны, а дзякуючы расейскаму прэзідэнту Уладзіміру Пуціну і пачатку ўварвання ва Украіну ў лютым 2022 года.**

Вынікам гэтай агрэсіі стала тое, што народ Фінляндыі стаў падтрымліваць хуткае (раптоўнае) уступленне краіны ў НАТА, а яе парламент павярнуўся практычна аднадушна да падтрымкі сяброўства ў НАТА. Да гэтага ўварвання, а менавіта ў студзені 2022 года, НАТА падтрымлівала менш за 30% фінаў, нягледзячы на вайну ў Грузіі ў 2008 і пачатак вайны ва Украіне ўвесну 2014-га. Хуткасць змены выразна ілюструецца тым фактам, што ўжо ў траўні 2022-га тры чвэрці фінаў былі за сяброўства ў НАТА. У адпаведнасці з прынцыпамі дзейнай дэмакратыі прэзідэнт краіны Саўлі Нійнісцё прыняў грамадскую думку да ўвагі і пачаў працэс уступлення Фінляндыі ў НАТА. (Табліца 1).

**Табліца 1**

**Працэс уступлення Фінляндыі ў НАТА**

| |
|---|
| **17 траўня 2022 года:** Прэзідэнт Фінляндскай Рэспублікі на прапанову ўрада прымае пастанову паінфармаваць Арганізацыю Паўночнаатлантычнага Трактату (NATO) аб зацікаўленасці Фінляндыі ўступіць у перамовы аб уваходжанні ў альянс. |
| **18 траўня 2022:** Дэкларацыя зацікаўленасці Фінляндыі ўступіць у НАТА перадаецца генеральнаму сакратару арганізацыі ў лісце, падпісаным міністрам замежных спраў. |
| **29 чэрвеня 2022:** У рамках саміту ў Мадрыдзе НАТА перадае запрашэнне Фінляндыі стаць яе сябрам. |
| **4 ліпеня 2022:** Прэзідэнт Рэспублікі прымае пастанову падаць НАТА пратакол аб намерах, які тычыцца ўступлення ў альянс і ахвоце выканання абавязкаў сябра арганізацыі. |
| **5 ліпеня 2022:** Усе краіны-сябры НАТА падпісваюць пратакол аб уступленні Фінляндыі, і яна становіцца сябрам НАТА ў статусе назіральніцы. |
| **5 снежня 2022:** Фінскі ўрад падае ў парламент прапанову аб уступленні Фінляндыі ў НАТА. |
| **1 сакавіка 2023:** Парламент ухваліў прапанову ўрада на ўступленне Фінляндыі ў НАТА. |
| **23 сакавіка 2023:** Прэзідэнт Фінляндскай Рэспублікі ўхваліў план уваходжання і праект закона аб уваходзе ў дзеянне Пагаднення аб далучэнні да НАТА. |
| **30 сакавіка 2023:** Усе краіны НАТА ратыфікавалі пратакол аб уступленні Фінляндыі. |
| **4 красавіка 2023:** Фінляндыя стала паўнапраўным сябрам НАТА. |

***Крыніца: Урад Фінляндыі***

У сакавіку 2023 у фінскім парламенце праходзіла галасаванне аб сяброўстве ў НАТА. Толькі сем з 200 яго чальцоў не падтрымалі ўступленне ў арганізацыю. Адзінымі асобамі, якія прагаласавалі супраць сяброўства Фінляндыі ў НАТА, сталі парламентарыі ад Левага Альянсу, пераемніка Камуністычнай партыі Фінляндыі і яшчэ аднаго чальца парламента.

**На пачатку красавіка 2023 года адбыўся геапалітычна значны момант у гісторыі Фінляндыі. Краіна далучылася да НАТА, і такім чынам нарэшце змагла выслабаніцца з зашмаргі, накінутай Сталіным на шыю «Панны Фінляндыі».**

Сяброўства Фінляндыі ў НАТА і санкцыі, звязаныя з уварваннем Расеі ва Украіну, мелі розныя наступствы для Фінляндыі і яе эканомікі.

**Па-першае,** абрынулася доля Расеі ў замежным гандлі Фінляндыі. У траўні 2023 года доля Расеі ў замежным гандлі Фінляндыі складала толькі 1%. Да пачатку вайны ва Украіне сітуацыя была іншай: у 2013 доля Расеі ў замежным гандлі была крыху меншая за 15%. (Табліца 2).[2]

**Табліца 2.**

| | 2013 | 2021 | Травень 2023 |
|---|---|---|---|
| доля Расеі ў фінскім экспарце (на падставе вартасці) | 10% | 5 % | 1.2 % |
| доля Расеі ў фінскім імпарце (на падставе вартасці) | 18% | 12 % | 0.7 % |
| доля Расеі ў фінскім імпарце сырой нафты (на падставе аб'ёму) | 86 % | 81 % | 0.0 % |
| доля Расеі ў фінскім імпарце нафтапрадуктаў (на падставе аб'ёму) | 35 % | 34 % | 0.0 % |
| доля Расеі ў фінскім імпарце вугалю (на падставе аб'ёму) | 68 % | 45 % | 0.0 % |
| доля Расеі ў фінскім імпарце электрычнасці (на падставе аб'ёму) | 26 % | 37 % | 0.0 % |
| доля Расеі ў фінскім імпарце трубнага газу (на падставе вартасці) | 100 % | 76 % | 0.0 % |
| доля Расеі ў фінскім імпарце звадкаванага прыроднага газу (на падставе аб'ёму) | - | 72 % | 0.0 % |

*Разам з паасобнымі ўсходнееўрапейскімі краінамі ЕЗ Фінляндыя па-ранейшаму імпартуе з Расеі ўран, які выкарыстоўваецца ў ядзерных рэактарах. Чвэрць магутнасцяў ядзернай энергетыкі была пабудаваная ў савецкую эпоху, і такім чынам гэтыя рэактары працягваюць спажыванне расейскага ўрану.

***Крыніца: Мытная служба Фінляндыі***

**Па-другое,** у тым жа месяцы, што Фінляндыя далучылася да НАТА, урад Расеі ўзяў пад свой кантроль энэргетычныя актывы фінскай кампаніі Фортум на сваёй тэрыторыі. Да нацыяналізацыі на долю апошняй прыпадала сама меней тры чвэрці вартасці ўсіх інвестыцый фінскіх кампаній у Расеі. На той перыяд вартасць актываў Фортум у Расеі складала 5-10 мільярдаў еўраў, у залежнасці ад метаду разліку.

**Па-трэцяе,** Расея закрыла консульствы Фінляндыі ў Петразаводску і Мурманску і сваё ўласнае консульства ў Лапііранце, да гэтага прыняўшы пастанову аб закрыцці фінскага генеральнага консульства ў Санкт-Пецярбургу ў кастрычніку 2023 года.

У якасці захадаў у адказ Фінляндыя плануе закрыць консульства Расеі ў Турку ў кастрычніку 2023 года. Існуе імавернасць таго, што Фінляндыя закрые расейскае консульства ў Марыегамне, на Аландскіх астравах, і магчыма нават выйдзе з Канвенцыі аб іх дэмілітарызацыі. Дапускаецца таксама, што на фінскай зямлі будуць стала размешчаныя замежныя войскі НАТА.

Калі Расея скарыстае ва Украіне ядзерную зброю, са сваёй тэрыторыі або з Беларусі, то Фінляндыі варта будзе набыць такую ж зброю разам з іншымі краінамі Скандынавіі і Балтыі, або нават самастойна. Не варта забываць, што стрымальны ядзерны патэнцыял НАТА шмат у чым грунтуецца на ядзернай зброі ЗША. У дадатак да яго, толькі Францыя і Вялікая Брытанія маюць свой уласны вайсковы ядзерны арсенал. Пры разглядзе стрымальных ядзерных сродкаў НАТА трэба памятаць, што ў лістападзе 2024 у ЗША

адбудуцца прэзідэнцкія выбары і што былы прэзідэнт Дональд Трамп мае супярэчлівае стаўленне да НАТА, прынамсі ў публічных выказваннях. Яшчэ адзін палітык-рэспубліканец, Рон ДэСантыс, у сваіх заявах таксама падкрэсліваў, што еўрапейскія краіны НАТА павінны браць адказнасць за бяспеку ў Еўропе. На ягоную думку, ЗША трэба факусавацца на стрымліванні росту ўплыву Кітая.

Сяброўства Фінляндыі ў НАТА несумненна падвышае бяспеку нашай краіны, бо наша суседка Расея праводзіць агрэсіўную палітыку, а пасля Пуціна яе замежная палітыка можа стаць яшчэ больш напружанай. Супольная з НАТА абарона ўзмацняе бяспеку Фінляндыі, але не гарантуе яе. З гэтай прычыны краіна мае далей рабіць інвестыцыі ва ўзброеныя сілы. На маю думку, выдаткаванне 2% унутранага брута-прадукту на абарону, як рэкамендуе НАТА, з'яўляецца недастатковым для Фінляндыі; замест гэтага яна павінна інвеставаць у абарону як мінімум 3% свайго УБП.[3] У дадатак да дадатковых фінансавых унёскаў агульны вайсковы абавязак, канцэпцыя ўсёабдымнай бяспекі і дадатковыя інвестыцыі ва ўнутраную бяспеку з'яўляюцца істотна неабходнымі для абароны і бяспекі Фінляндыі.

Я вывучаю Расею больш за 30 гадоў, і я з радасцю канстатую, што ўступленне Фінляндыі ў ЕЗ у 1995 і ў НАТА ў 2023 з'яўляюцца самымі значнымі падзеямі за ўсю маю кар'еру. Краіна канчаткова і цалкам далучылася да супольнасці краін Захаду. Аднак гэта не азначае, што пагрозы з боку Расеі больш не існуе, але

мы цяпер лепш падрыхтаваныя да будучыні. Пагроза з Усходу знікне тады, калі Крэмль зразумее, наколькі дэструкцыйная яго настальгія аб імперыі, як для сваёй краіны, так і для суседзяў.

Навука сяброўства Фінляндыі ў НАТА для іншых краін, якія імкнуцца ў НАТА: сяброўства ў НАТА ніколі не было ўнутранай вартасцю для Фінляндыі, а было спосабам адасаблення Фінляндыі ад сферы ўплыву Расеі і заканчэння яе заходняй інтэграцыі. Гэты працэс трываў на працягу ўсяго перыяду незалежнасці Фінляндыі, пачынаючы з раззбраення расейскіх войскаў на фінскай зямлі ў 1918 годзе, працягваючыся павольным далучэннем да заходніх арганізацый, што ўмацоўвала статус Фінляндыі ў міжнароднай палітыцы, і заканчваючы сяброўствам Фінляндыі ў НАТА ў красавіку 2023 года. Важным элементам працэсу ўступлення Фінляндыі ў НАТА з'яўляецца закуп заходняй зброі, які забяспечыў спалучальнасць Сіл абароны Фінляндыі з НАТА яшчэ да таго, як фактычнае сяброўства было рэалізаванае.

Яшчэ адзін адметны момант у тым, што Фінляндыя асцярожна прасоўвала сваё сяброўства ў НАТА, не выклікаючы канфлікту з Расеяй. Аднак, на маю думку, Фінляндыя мела ўступіць у НАТА ўжо ў 1999 годзе разам з краінамі Усходняй і Цэнтральнай Еўропы або найпазней у 2004 годзе, калі ў НАТА ўступілі краіны Балтыі. На жаль, тагачаснае кіраўніцтва Фінляндыі яшчэ не ўсведамляла, што Расея знаходзіцца на шляху да настальгіі аб імперыі ў форме дыктатуры.

**Перадумовай бяспекі Фінляндыі і ўсёй Еўропы з'яўляецца дэмакратычнае развіццё дзяржаў-суседзяў Еўрапейскага Звязу. Я спадзяюся, што эліты Паўночнай Афрыкі, Блізкага Усходу, Беларусі і Расеі разумеюць важнасць дэмакратыі, бо дыктатуры — гэта толькі квазіўстойлівыя дзяржавы. Усе дыктатуры рана або позна разбураюцца, выклікаючы нестабільнасць і, магчыма, нават ставячы пад пагрозу існаванне гэтых дзяржаў.**

Я спадзяюся, што я яшчэ ўбачу на чале Расеі таго, хто шануе дэмакратыю і паважае фундаментальныя правы чалавека як у Расеі, так і за мяжой. Маё спадзяванне можа выявіцца марным, але яно патрэбнае для таго, каб мы, фіны, у будучыні не сутыкнуліся і не зазналі турбулентнасці, выкліканай Расеяй.

---

1. Згодна з заканадаўствам аб спецыяльных службах 2019 года, Supo стала фінскай службай бяспекі і выведкі ў цывільных справах. Фінскія сілы абароны маюць сваё ўласнае падраздзяленне вайсковай выведкі.

2. Для параўнання: на Расею прыпадала 60% замежнага гандлю Беларусі, а ў пастаўках энэрганосьбітаў яна амаль цалкам абапіралася на Расею.

3. У 2022 годзе Расея выдаткоўвала афіцыйна больш за 4% свайго УБП на вайсковыя патрэбы. У рэчаіснасці гэтая лічба вышэйшая.



***Кары Люхто*** *атрымаў доктарскую ступень Універсітэта Глазга, Вялікая Брытанія, у 1997 годзе, і ступень доктара навук Школы эканомікі Турку, Фінляндыя ў 2000 годзе. Люхто быў намінаваны на пасаду штатнага прафесара міжнароднага бізнэсу ў Тэхналагічным універсітэце Лапээнранты ў 2000 годзе, быў дырэктарам Пан'еўрапейскага інстытута Універсітэта Турку з 2003 года і дырэктарам Фонду Centrum Balticum з 2011 года.*

*Прафесар Люхта браў удзел у некалькіх праектах, якія фінансуюцца Еўрапейскай камісіяй і некалькімі міністэрствамі Фінляндыі. Люхто з'яўляецца заснавальнікам і галоўным рэдактарам адной з вядучых сусветных дыскусійных платформаў, прысвечаных рэгіёну Балтыйскага мора, а менавіта агляду Baltic Rim Economies (BRE), які публікуецца штоквартальна з 2004 года.*

## *РАСЕЯ / ЗША*

## *Беларусь як геапалітычны ключ да бяспекі Еўропы*

***Юрый Фяльштынскі***

Усходнееўрапейская дзяржава, што мяжуе з Расеяй, Польшчай, Украінай, Літвой і Латвіяй, якая з'яўляецца асобным буферам паміж Расеяй і Еўропай і не мае сваіх партоў, у сучасным свеце закліканая быць зручнай транзітнай зонай, якая лучыць Усход і Захад, Расею і Еўропу. Так і было з канца 1991 году, калі Беларусь атрымала сваю незалежнасць. Пад 2022 год гэтая транзітная зона стала плацдармам для запланаванага ўварвання Расеі ва Украіну і ўварвання расейскіх войскаў ва Усходнюю Еўропу пасля захопу Украіны.

**Трансфармацыя Беларусі з незалежнай дэмакратычнай краіны ў расейскі пратэктарат, які ўзначальвае кіраваны з Крамля дыктатар, заняла 25 гадоў. Абраны ў 1994 годзе прэзідэнтам краіны Аляксандр Лукашэнка ні ў дэмакратыю, ні ў незалежнасць сваёй краіны не верыў.**

Яго абранне з'явілася наступствам стомленасці беларускага народа ад цяжкай эканамічнай бязладзіцы пачатку 1990-х гадоў, выкліканых крахам СССР і знікненнем звыклай для савецкіх грамадзян планавай дзяржаўнай эканомікі, на змену якой яшчэ не прыйшла рынкавая, якая пачала дзейнічаць трохі пазней. На гэтых эканамічных узрушэннях лёгка згуляў хітры Лукашэнка, які паабяцаў сваім выбаршчыкам стабільнасць і дабрабыт. Цана гэтай стабільнасці ў 1994 годзе зразумелая яшчэ не была.

8 снежня 1999 года, незадоўга да свайго адыходу з пасады прэзідэнта, састарэлы Барыс Ельцын (які перадаў 31 снежня Расею пад кантроль дзяржаўнай бяспекі ў асобе Пуціна), падпісаў указ “Аб стварэнні саюзнай дзяржавы Расеі і Беларусі”. Лукашэнка да гэтага дня быў ужо аўтарытарным дыктатарам. Пуцін толькі станавіўся на гэтую сцежку. Уладу з рук адмовіўся выпусціць і першы, і другі. Абодва засталіся кіраваць сваімі краінамі пажыццёва.

Усё больш і больш Беларусь уцягвалася ў арбіту Расейскай Федэрацыі, спакваля становячыся плацдармам для рыхтавання расейскай агрэсіі супраць суседзяў. У зону рызыкі трапілі найперш Украіна, Польшча і Літва. З'яўленне расейскіх авіябаз у Беларусі, безупынныя супольныя вучэнні і фармальна ўзятыя на сябе Расеяй абавязкі ахоўваць вонкавую мяжу Беларусі сталі рэальнымі паказальнікамі на тое, што ў будучым вайсковым канфлікце Беларусь будзе на старане Расеі і дасць ёй для атакі сваю тэрыторыю.

Вайсковая кампанія Расеі супраць Украіны, распачатая ў сакавіку 2014 года, мела толькі частковы поспех. Расея захапіла Крым і пачала аперацыю “Наваросія” з мэтай авалодання ўсходнімі і паўднёвымі тэрыторыямі Украіны і прарыву да Прыднястроўскага рэгіёну Малдовы, дзе з 1995 года былі сканцэнтраваныя расейскія войскі, якія налічвалі ў той момант 3500 чалавек. Аднак аперацыя “Наваросія” зазнала крах. Праткнуцца да Прыднястроўя расейскія войскі не змаглі. За адзіны поспех Расеі ў кампаніі 2014 года, апроч Крыма, можна было ўважаць распачатую вайну на Данбасе і фармальнае ўтварэнне нікім не прызнаных “Данецкай” і “Луганскай” народных рэспублік.

Беларусь унікла тады дырэктыўнага ўдзелу ва ўзброеным канфлікце на баку Расеі, але ў палітычнай і дыпламатычнай сферы відавочна падтрымала расейскую агрэсію. Невыпадкова кабальныя ўмовы "мірных пагадненняў", навязаных Украіне, падпісваліся менавіта ў Менску і атрымалі назву "менскія".

**У самой Беларусі сітуацыя моцна змянілася пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года, на якіх Лукашэнка саступіў. Лукашэнка адмовіўся прызнаць паразу і пакінуць сваю пасаду. Пратэставы рух быў жорстка задушаны ў тым ліку з дапамогай расейскіх войскаў, таемна перакінутых з Расеі і пераадзетых у беларускую форму. Лукашэнка здолеў застацца ва ўладзе, цяпер ужо як дыктатар. Але якую-**

**небудзь самастойнасць у стасунках з Расеяй і Пуціным ён страціў.**

Беларусь пакрысе запаўнялася расейскім войскам. Надыходзіў 2022 год, на які быў запланаваны захоп Расеяй Украіны. Беларусь мела адыграць у гэтай вайсковай кампаніі самую галоўную ролю: кірункам галоўнага ўдару расейскага войска гэтым разам быў кіеўскі, з Беларусі. Пачынаць кампанію 2022 года ўдарамі з Поўдня і Усходу, як гэта было зроблена ў 2014-м, азначала ператварыць вайну ў пазіцыйную ўжо на першым яе этапе. Наступ з Поўначы на Кіеў меўся забяспечыць Расеі пераможны бліцкрыг, параўнальны з Крымскай аперацыяй сакавіка 2014 года.

**Лукашэнка даў тэрыторыю Беларусі для канцэнтрацыі расейскіх войскаў і атакі на Кіеў. Неўзабаве пасля пачатку вайны на загад Пуціна ён затэлефанаваў прэзідэнту Украіны Уладзіміру Зяленскаму і ад імя Пуціна прапанаваў Украіне капітуляваць. Зяленскі адмовіўся.**

Вайна трывае ўжо доўгі час і забрала жыццё сотняў тысяч людзей. Яна можа закончыцца пры трох умовах:

калі заходнія хаўруснікі Украіны прымуць пастанову аб выдачы Украіне ў патрэбнай колькасці наступальных тыпаў узбраення, у тым ліку ракет далёкага радыусу дзеяння;

калі яны дазволяць Украіне выкарыстоўваць гэтую зброю для нанясення ўдараў па тэрыторыі супрацiўніка — Расейскай Федэрацыі, у тым ліку Маскве;

калі яны, супольна з Украінай, ліквідуюць пагрозу ў дачыненні да Украіны, Польшчы, Літвы і Латвіі, якая ідзе з Беларусі, бо сёння, праз паўтара года Беларусь далей застаецца найважнейшым геапалітычным плацдармам расейскай агрэсіі ў Еўропе. Пра гэта сведчаць і шматлікія агрэсіўныя заявы беларускага дыктатара Лукашэнкі і ягоных прапагандыстаў, і вывад Беларусі ў канцы лютага 2022 года са статусу бяз'ядзернай дзяржавы, і, нарэшце, распачатае перакідванне ў Беларусь расейскай тактычнай ядзернай зброі і вайсковых фармаванняў групы “Вагнер”, якія пагражаюць уварваннем з беларускай тэрыторыі ва Украіну, Польшчу і Літву.

**Можна разглядаць усякія тэарэтычна магчымыя сцэнары заканчэння расейска-ўкраінскай вайны. Але ніводзін з гэтых сцэнараў не гарантуе міру Украіне і Усходняй Еўропе, калі ён не будзе прадугледжваць адначасовага вызвалення Беларусі ад расейскай акупацыі, падзення рэжыму Лукашэнкі і аднаўлення дэмакратыі ў Беларусі. Напраўду без папярэдняга або адначасовага вызвалення Беларусі немагчымае заканчэнне расейскай вайны ва Украіне.**

У той жа час страта Расеяй кантролю над Беларуссю робіць немагчымым для Расеі вядзенне вайсковых дзеянняў супраць Украіны на паўночным кірунку, асуджаючы яе на пазіцыйныя баі супраць украінскага войска на Поўдні і Усходзе — двух кірунках, з вайскова-стратэгічнага пункту гледжання абсалютна бесперспектыўных. Расея не можа ні перамагчы ў вайне супраць Украіны, ні хоць неяк значна прасунуцца ў гэтай вайне ўглыб Украіны з Усходу і Поўдня, калі яна страчвае Беларусь, у той час як усходняя Еўропа з вызваленнем Беларусі набывае найважнейшы буфер бяспекі, які падзяляе Усходнюю Еўропу і Расею.

**Для аднаўлення незалежнасці Беларусі ёсць усе неабходныя варункі. Насельніцтва гэтай краіны ўжо ў 2020 годзе прадэманстравала сваю прыхільнасць дэмакратыі, калі спрабавала мірным пратэставым рухам прымусіць Лукашэнку пайсці ў адстаўку. Сотні апазіцыйных палітыкаў апынуліся за кратамі. Шэраг лідараў апазіцыі быў вымушаны пакінуць краіну. Яны знаходзяцца за мяжой і ахвочыя вярнуцца на радзіму для працягу сваёй дзейнасці, як толькі гэта дазволяць абставіны.**

Дзясяткі тысяч беларусаў з'ехалі з дзяржавы, дзе немагчыма было цяпер свабодна жыць і працаваць. Але яны вернуцца ў Беларусь з вяртаннем дэмакратыі. Касцяк узброеных сіл вольнай Беларусі сёння

ваюе поплеч з украінскім войскам супраць расейскай агрэсіі. Гэтыя людзі ахвочыя ініцыяваць і ўзначаліць нацыянальна-вызваленчы рух Беларусі за вызваленне яе ад рэжыму Лукашэнкі і расейскай акупацыі. Натуральнымі хаўруснікамі Беларусі ў гэтай барацьбе будуць Украіна і краіны НАТА, зацікаўленыя ў ліквідацыі навіслай над Еўропай пагрозы, якая ідзе ад рэжыму Лукашэнкі, кіраваным Пуціным.

На заканадаўчым узроўні дэмакратычная Беларусь мае перагледзець і дэзавуяваць усе тыя дамоўленасці, якія былі дасягнуты старым урадам на шкоду інтарэсам і незалежнасці краіны. Беларусь абавязана вярнуць сабе бяз'ядзерны статус, адмовіцца ад размяшчэння на сваёй тэрыторыі расейскай ядзернай зброі, выйсці са шматлікіх кабальных пагадненняў з Расеяй, у тым ліку саюзнай дамовы ад 8 снежня 1999 года, розных вайсковых пагадненняў, і адмовіцца ён супрацоўніцтва з Расеяй у СНД, АДКБ і ЕАЭС. Выхад з гэтых міждзяржаўных структур з'яўляецца абавязковай умовай для набыцця Беларуссю незалежнасці.

Для гарантавання вайскова-палітычнай і эканамічнай бяспекі сваёй краіны ў будучыні новы ўрад Беларусі мае разгледзець пытанне аб уваходжанні ў НАТА, з аднаго боку, і Еўразвяз — з другога. Залучэнне ў НАТА і Еўразвяз яшчэ і Украіны дазволіць, нарэшце, Еўропе стварыць уздоўж меж Расеі адзіны блок хаўрусных дзяржаў, здольны супрацьстаяць усякай патэнцыйнай пагрозе Расеі і гарантаваць Еўрапейскаму кантыненту мір, парушаны Расеяй у 21-м стагоддзі прынамсі чатыры разы: у жніўні 2008 года (у

Грузіі), у сакавіку 2014 года (ва Украіне), у студзені 2022 года (у Беларусі) і ў лютым 2022 года (зноў ва Украіне).

**Беларусь не зможа захаваць сваю незалежнасць, калі застанецца за межамі НАТА і ЕЗ і замест гэтага абвесціць аб нейтралітэце або ўступіць у нейкія рэгіянальныя аб'яднанні кшталту Балтыйска-Чарнаморскага звязу.**

Пытанне аб чарговай спробе захопу яе Расеяй будзе ў гэтым выпадку толькі пытаннем часу дакладна гэтак жа, як стала яно пытаннем часу для Украіны перыяду 2014-2022 гадоў.



***Юрый Фяльштынскі*** *– расейска-амерыканскі гісторык.*
*Аўтар кніг “Узрываючы Украіну: вяртанне расейскага тэрору і пагроза Трэцяй сусветнай вайны” і “Ад Чырвонага тэрору да мафіёзнай дзяржавы. Спецыяльныя службы Расеі ў барацьбе за сусветнае панаванне”.*

## *ПОГЛЯД З ВУГОРШЧЫНЫ*

## *Шлях Беларусі ў НАТА*

***Іштван Д’ярмаці***

**Беларусь у НАТА? Якая недарэчная ідэя!**

Так большасць адрэагавала б на такую прапанову. Але "недарэчныя ідэі" могуць стацца ні чым іншым, як бачаннем таго, што такое можа адбыцца, і адбыцца раней, чым большасць магла б сабе ўявіць. Дазвольце мне ўдакладніць сцісла, чаму я мяркую, што гэта не "недарэчная ідэя", і не проста меркаванне, а неўнікнёная неабходнасць.

Існуе вялікая розніца ў падыходах да разгляду бягучага становішча з бяспекай у Еўропе. Гэта нядзіўна: тое, што мы назіраем сёння, гэта надзвычай складаная сітуацыя, якая нагадвае халодную вайну, але шмат у чым ад яе адрозніваецца. Тут іншыя першапрычыны і розныя гульцы ў параўнанні з тымі, што былі ў другой палове дваццатага стагоддзя; адрозніваюцца і развязанні — калі такія наогул ёсць, а таксама перспектывы.

**На сяброўства Беларусі ў НАТА трэба зірнуць з двух ракурсаў.**
**Першы: ці з'яўляецца гэта тым, чаго хоча беларускі народ?**

**Другі: які стратэгічны кантэкст, у рамках якога такі аналіз мае сэнс?**

**Пачнём з першага. Цалкам відавочна, і апошнія выбары, і асабліва падзеі за імі, адназначна прадэманстравалі, што беларускі народ жадае дэмакратыі, свабоды і нармальнага жыцця.**

У той жа меры, як і іншыя народы Еўропы (і ўсяго свету). Яны бачаць і бліскучы прыклад краін Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы, дзе былыя савецкія калоніі сталі нармальнымі дэмакратыямі.

І, неспадзяванка – усе яны з'яўляюцца (дзейнымі або будучымі) сябрамі НАТА (і Еўрапейскага Звязу). Гэта само сабой моцны аргумент у іхніх (і нашых) вачах для далучэння Беларусі да гэтых краін у якасці дэмакратычнай, свабоднай і незалежнай дзяржавы (і маючы на ўвазе таксама сяброўства ў НАТА і Еўрапейскім Звязе ў будучыні). Але гэта не поўная карціна. Няма сумневу, што народ Беларусі жадае дэмакратыі і незалежнасці. Але я не бяруся меркаваць, што, улічваючы агрэсію Расеі супраць Украіны, усе яе грамадзяне бачаць і згодныя з тым, што ў цяперашняй геастратэгічнай сітуацыі сяброўства ў НАТА з'яўляецца адзіным спосабам безумоўнага забеспячэння незалежнасці краіны, такім чынам, каб быць упэўненым у тым, што ніякае ўмяшанне звонку (з боку Расеі) не змагло б пахіснуць іхнюю дэмакратыю.

Чаму так? Гэта лёгка зразумець, калі зірнуць на бягучую сітуацыю з гістарычнага пункту гледжання. Па-першае, грамадскае фармаванне беларусаў

адбывалася ў рэжыме савецкага тыпу. Пры дыктатуры, дзе ім безупынна навязвалася меркаванне, што гэта і ёсць найлепшая форма кіравання, і ў выніку, што адзіны шлях гарантыі ўнутранай стабільнасці і бяспекі краіны — праз супрацоўніцтва з Расеяй.

І такі аргумент нельга з лёгкасцю адкідаць. Вядома, добрыя суседскія стасункі з нашмат мацнейшай дзяржавай могуць быць вельмі выгадныя. Пры ўмове, што сусед дэмакратычны, не мае спроб умяшанне ва ўнутраныя справы вашай краіны, не мае тэндэнцыі і моцнага жадання дамінаваць над іншымі, асабліва суседзямі, і ўрэшце, не хоча тым або іншым спосабам, далучыць іх.

Усё гэта гучыць добра, але Расея такой краінай не з’яўляецца. Яе гісторыя — гэта гісторыя расейскага экспансіянізму, раней, да іх захопу пад маскай "інтэрнацыяналізму" — простая заваёва тэрыторый. Цяперашняя Расея не з'яўляецца выняткам: наадварот, пуцінская Расея больш агрэсіўная, чым большасць яе папярэднiц, у тым ліку нават постсталінскі Савецкі Саюз.

Для Пуціна Украіна — гэта толькі першы крок.

Ягоная мэта — не аднаўленне Савецкага Саюза. Ён ідзе нашмат далей за гэта. Ягонае бачанне — гэта "расейскі свет". Што гэта значыць? Сцісла, і гэта відавочна пэўнае спрашчэнне, гэта азначае, што дзе б расейцы ні жылі — ўсё гэта для іх законная расейская тэрыторыя.

Больш за тое, дзе б расейцы калі-небудзь ні жылі — гэта таксама законная расейская зямля. І гэта не новае паняцце: памятаеце, якім быў тытул цара? Ты-

тул азначаў, што цар быў "царом усіх расейцаў". Не "Расеі", а "ўсіх расейцаў", гэта значыць, дзе б расейцы ні жылі, цар з'яўляецца іхнім уладаром. А пад гэта трапляе, вядома, і тэрыторыя, дзе яны жывуць.

Ільін і Дугін, ідэолагі пуцінскага двара, далі гэта ясна зразумець, як і, безумоўна, сам Пуцін. У цяперашняй сітуацыі гэта, магчыма, прагучала б крыху недарэчна, але ён рабіў гэта шмат разоў на працягу апошніх гадоў. І ніколі з гэтай ідэяй не расставаўся. Украіна — гэта толькі першы крок. Ён і ягоныя памагатыя выказваліся аб гэтым часта і недвухсэнсоўна. "Праект пагаднення", прадстаўлены ў снежні 2021, выразна паказаў, што наступным крокам было б аднаўленне расейскага панавання над Цэнтральнай і Усходняй Еўропай, такім чынам дэ-факта НАТА было б знішчанае. Гэта выразна дэманструе, што наступнай мэтай было б заваяванне згаданых краін пасля таго, як яны страцяць абарону НАТА.

**Такім чынам, беларускаму народу патрэбная дэмакратыя, каб зразумець, што трэба зрабіць, каб пачувацца ў бяспецы, маючы пад бокам расейскага суседа. Гэта мае стаць скрозь часткай агульнаадукацыйных захадаў для грамадзян пры пераходзе ад дыктатуры да дэмакратыі (адной з памылак, якую мы зрабілі ў некалькіх новых дэмакратыях Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, стала тое, што мы не патлумачылі, што напраўду азначае дэмакратыя, што неабходна для яе развіцця ў сва-**

**ёй уласнай краіне, і што бяспека з'яўляецца важным складнікам дэмакратыі).**

З улікам вышэйсказанага адзначу, што гэта хоць і цяжкая, але не немагчымая задача. Яна мае стаць часткай падрыхтоўкі Беларусі да ўступлення ў НАТА. Я не буду падаваць драбніцы таго, што неабходна, каб выканаць умовы для сяброўства і падрыхтавацца да ўступлення ў НАТА. Вышэйназваная задача стане адной з іх. І тут я хачу заявіць: мы не маем дапускаць, каб гэты працэс расцягнуўся на дзесяцігоддзе. Дэмакратыя мае стабілізавацца хутка. Разам з гэтым павінна гарантавацца бяспека краіны. Я б выказаў меркаванне, што на гэта можа спатрэбіцца некалькі гадоў, не больш, пасля таго, як у Беларусі ўсталюецца дэмакратыя.

Яшчэ адна заўвага аб бягучым момансе. Я перакананы, што тыя, хто жадае дэмакратычных пераўтварэнняў у Беларусі, ужо цяпер павінны пачаць тлумачыць, што неабходна Беларусі, каб стаць бяспечнай і спакойнай краінай. Трэба пачынаць адукоўваць людзей што да таго, якую пагрозу нясе Расея. І калі ўзнікне пытанне, што рабіць з такой пагрозай, становіцца відавочнай неабходнасць уступлення ў НАТА.

Адзін з самых вялікіх выклікаў цяпер і ў будучыні — як супрацьстаяць расейскай прапагандзе. Не мае быць сумневаў, што нават пасля ўсталявання дэмакратыі ў Беларусі Расея не спыніць сваю падрыўную прапаганду. Наадварот, яна стане мацнейшай і нават агрэсіўнейшай. І яна будзе знаходзіць хаўруснікаў і

прыхільнікаў таксама і ўнутры новай, дэмакратычнай Беларусі. Як супрацьстаяць расейскай прапагандзе, у нейкай ступені з'яўляецца цяпер праблемай і для дэмакратычных краін Еўропы. І гэта будзе няпростай задачай таксама і для Беларусі.

Пяройдзем цяпер да другога пытання — стратэгічнага кантэксту.

Павелічэнне НАТА заўсёды было супярэчлівай праблемай. Адной з уласцівых супярэчнасцяў было супраціўленне Расеі, моцна перабольшанае, але зразумелае, хоць і непрымальнае. Часткай гэтага супраціўлення, якую было складаней зразумець і пераадолець, была апазіцыя знутры: даволі значная частка палітыкаў, а яшчэ большая колькасць экспертаў, якія складаюць такім чынам грамадскую думку, заўсёды выступала супраць павелічэння НАТА. Мы не хочам паглыбляцца ў прычыны гэтага, а сканцэнтруемся толькі на адным "аргуменце" — легітымныя інтарэсы Расеі што да яе бяспекі нібы павінны прымацца да ўвагі і задавальняцца.

Само сабой, гэта зразумелае і прымальнае меркаванне. Аднак ёсць адна невялікая праблема: што разумець пад словам "легітымны"?

Згаданыя вышэй эксперты і палітыкі меркавалі, што Расея, і толькі Расея, можа самастойна вызначаць, якімі з'яўляюцца яе легітымныя інтарэсы ў сферы бяспекі. Нават у выпадку дэмакратычных краін гэта не зусім дакладна, бяспека ж з'яўляецца складаным пытаннем, бо бяспека адной краіны ўплывае на бяспеку іншых. І чым бліжэйшая краіна геаграфічна, тым мацнейшы такі ўплыў. Такім чынам, суседзі за-

звычай знаходзяцца пад вялікім уплывам. Сёння, у эпоху глабалізацыі, фактычна, хаця і ў меншай ступені, глабалізуюцца і вайсковыя дзеянні. Адпаведна, маюць прызнавацца легітымнымі толькі такія інтарэсы бяспекі, пры якіх бяруцца да ўвагі і паважаюцца інтарэсы бяспекі іншых, асабліва суседзяў.

Пытанне набывае яшчэ большую складанасць, калі краіна, пра якую ідзе гаворка, не з'яўляецца дэмакратыяй. У выпадку з Расеяй ніхто разважны ніколі б не сцвярджаў, што Расея з'яўлялася дэмакратыяй, за выняткам Пуціна, але гэта не вартае сур'ёзнага стаўлення (вядома, Керанскага і Ельцына можна было ўспрымаць як асоб, што мерыліся стварыць дэмакратыю, але няўдала). Адпаведна, кіраўніцтва такіх краін, у нашым выпадку Расеі, не абавязкова выказвае рэальныя інтарэсы народа і краіны, і гэта яшчэ больш відавочна, калі ідзе гаворка пра бяспеку. І калі мы гаворым пра Расею, чыя гісторыя была гісторыяй экспансіі, і якая ніколі не спынялася перад тым, каб выкарыстаць сілу для ажыццяўлення экспансіі, мае быць ясна, што інтарэсы бяспекі, як іх вызначае кіраўніцтва Расеі, не павінны разглядацца як "легітымныя".

Якія тады легітымныя інтарэсы бяспекі Расеі? Гэта надзвычай складанае пытанне, бо вельмі цяжка знайсці яго дакладную крыніцу. Ці з'яўляецца ім расейская апазіцыя? Напраўду не, бо ў шмат якіх выпадках яны таксама знаходзяцца пад пэўным уплывам расейскай ідэалогіі (глядзі Салжаніцына і нават Навальнага).

Ці такімі з’яўляюцца замежныя палітыкі і/або эксперты? Гэта прынцыповая аблуда, што замежнікі валодаюць праўдай пра якую-небудзь іншую краіну. Але на практыцы гэта зрабіць яшчэ цяжэй, бо ў экспертаў існуе вялікая разбежнасць у спробах даць азначэнне таму, якімі з'яўляюцца інтарэсы бяспекі Расеі.

Высновы такія: як у мінуўшчыне, так і ў будучыні давядзецца знайсці пераканаўчае азначэнне інтарэсаў Расеі ў галіне бяспекі, якое было б універсальным альбо хаця б прызнавалася большасцю, нават калі гэтая большасць не будзе ўключаць лідараў Расеі. Прагматычнае развязанне – або болей *modus vivendi* - гэта паспрабаваць прыйсці да пагаднення аб тым, што НЕ з'яўляецца легітымным, гэта значыць, якія інтарэсы бяспекі Расеі непрымальныя. На такую спробу магла б пагадзіцца большасць прыхільнікаў прымірэння з Расеяй. Урэшце, кожная краіна, а таксама НАТА і Еўрапейскі Звяз, змаглі б прапанаваць сваё азначэнне, якое б паслужыла для іх падмуркам стратэгіі ў дачыненні да Расеі.

Давайце зірнём на тое, што не можа быць прымальным у якасці легітымных інтарэсаў Расеі ў галіне бяспекі, але ўсе яны былі абвешчаныя легітымнымі Пуціным.

Права ўплываць або нават вызначаць тып і склад урада іншай краіны. Так, я ведаю пярэчанні: а як наконт умяшання ЗША ды іншых дэмакратычных краін у "пабудову дэмакратыі"? Ізноў жа, гэта заслугоўвае разгляду ў іншых, аналагічных артыкулах; але я абмяжуюся тым, што там усё па-іншаму, і калі хто-небудзь жадае пазбавіцца ад дыктатуры і стварыць

пэўны тып дэмакратыі — гэта адно, а іншае — наадварот, калі хтосьці імкнецца падтрымаць або стварыць унутраныя сілы для ўсталявання дыктатуры. Так, у пэўных выпадках ЗША ды іншыя таксама дзейнічалі аналагічным спосабам, што можна ўважаць за памылку, але вядома, гэта не дае нам права рабіць яе зноў і зноў. І яшчэ адно адрозненне: апошні раз ЗША захоплівалі і далучалі тэрыторыю ў 19-м стагоддзі, у той час як Расея цяпер знаходзіцца ў стадыі такога працэсу і рабіла гэта ва ўсе часы.

> **Яшчэ адна рэмарка: мы, тыя, хто шануе вартасці дэмакратыі, вяршэнства закона і правоў чалавека, не саромеемся прызнаць: так, мы мяркуем, што цалкам легітымна, і больш за тое, з'яўляецца нашым абавязкам "умяшацца" ва ўнутраныя справы іншай краіны. У пэўных выпадках гэта цалкам законна, грунтуючыся на міжнародных правілах, як напрыклад, у выпадку "гуманітарнага ўмяшання"[1] або "грубага парушэння правоў чалавека"[2].**

Аднак пара стаць больш цвёрдым і пайсці далей: у пэўных выпадках нам варта так рабіць, нават калі гэта неабавязкова адпавядае міжнародным правілам: прасоўваць дэмакратыю, калі гэта робіцца ў якасці вынятка і робіцца правільна, і калі адрозніваецца ад імперыялістычных дыктатур, якія ўрываюцца ў іншыя краіны. Давайце набяромся мужнасці і скажам: дзве падобныя рэчы не заўсёды сапраўды падобныя.

Нашы прынцыпы стаяць вышэй за прынцыпы тых дыктатараў, бо яны служаць агульнаму дабру народа. Тым самым яны могуць апраўдаць пэўныя крокі, якія неабавязкова пільнуюцца літары закону, але з'яўляюцца правамернымі.

**Але вернемся да НАТА. Найчасцей ужываным аргументам супраць павелічэння НАТА з'яўляецца той, што гэта справакавала б Расею на рэакцыю ў адказ, якая магла б прычыніцца да шырокамаштабнага канфлікту, трэцяй сусветнай вайны і г.д. Перад тым як гэта аспрэчваць, давайце задамо пытанне: чаму НАТА павялічылася за апошнія дзесяцігоддзі? І адказ такі: з той жа прычыны, з якой яна стваралася ў 1949 годзе — расейская пагроза і боязь расейскага ўварвання. Калі было легітымным "правакаваць расейцаў" у 1949 і было легітымным "рызыкаваць распачынаннем шырокамаштабнага канфлікту" ў 1949 з прычыны таго, што краіны і народы баяліся расейскай экспансіі, чаму нелегітымна зрабіць гэта цяпер?**

Прычына стварэння і павелічэння НАТА ўсё тая ж: экспансія і агрэсіўнасць Расеі і часцяком дырэктыўная пагроза іншым краінам.

Рэакцыяй на гэта не мае стаць меркаванне або патрабаванне ўзяць да ўвагі "легітымныя інтарэсы

бяспекі" і грунтаваць нашу палітыку на гэтай гіпотэзе, а наадварот, зрабіць немагчымым для Расеі рэалізаваць тыя "легітымныя інтарэсы", бо яны НЕЛЕГІТЫМНЫЯ. Гэта можа прагучаць дзіўна, але стрымаць расейскі экспансіянізм — таксама ў інтарэсах Расеі і яе народа.

Па-першае, гэта ратуе іх ад разбуральнай вайны, якая магла б знішчыць большую частку іхняй краіны і забіць мільёны расейцаў. Я не думаю, што вялікім суцяшэннем для тых людзей было б тое, што таксама загінуць мільёны іншых людзей. І мяркую таксама, што калі прыйдзе канец імперскай палітыцы Расеі, сітуацыя ўнутры Расеі таксама пакрысе будзе мяняцца да лепшага. Нацыяналізм і падбухторванне да вайны саступіць месца рэальным тэмам: дэмакратыі, добрым суседскім стасункам, супрацоўніцтву. Грошы, змарнаваныя на падрыхтоўку да вайны, будуць выдаткаваныя на дабро народа. Маю моцнае перакананне, што дэмакратыя не зможа прагрэсаваць у Расеі датуль, пакуль у цэнтры расейскай палітыкі знаходзіцца такое імперскае распальванне войнаў.

Хоць мы наўрад можам паўплываць на ўнутраную сітуацыю ў Расеі (акрамя спроб дапамагчы сілам дэмакратыі, якія нараджаюцца), але мы цалкам здатныя стварыць вонкавыя варункі, якія змогуць паволі расхістаць і аслабіць замежную палітыку Расеі, такім чынам расхінаючы шлях больш рэалістычнай і накіраванай на супрацоўніцтва палітыцы, якая ў выніку аслабляе ўнутраную дыктатуру ў Расеі.

У дадатак да стратэгічных прычын, што расейскаму экспансіянізму, рэвізіянізму, агрэсіўнасці і, адпа-

ведна, расейскай пагрозе трэба супрацьстаяць дзеля нашай уласнай бяспекі, для мяне відавочна, што гэта і ў інтарэсах расейскага народа.

**NATO — адзіная структура, якая можа эфектыўна супрацьстаяць расейскай пагрозе. Калі мы жадаем павысіць яе дзеяздольнасць, мы павінны зрабіць усё магчымае, каб колькасць яе сяброў расла. Новыя сябры ўзмацняюць НАТА. Асабліва гэта тычыцца краін, якія мяжуюць з Расеяй. Такім чынам, мы павінны закончыць пабудову рэальнай еўрапейскай бяспекі, прыняўшы ў НАТА тры астатнія дзяржавы: Украіну, Грузію і Беларусь.**

Так, варункі пакуль не саспелі для таго, каб зрабіць гэта неадкладна. І гэта не тлумачыцца вайной ва Украіне. Пастанова саміту ў Вільні не прымаць Украіну ў НАТА контрпрадукцыйная, бо яна дае Расеі права вета, чаго ніколі не было раней, і недарэчна, што гэта адбылося, калі Расея як ніколі слабая, але і з іншых прычын у гэтых краінах, як унутраных, так і вонкавых. Нам неабходна дакладна заявіць, што НАТА трэба павялічваць, каб запоўніць пустэчы. Гэта не толькі ўмацуе альянс і тым самым бяспеку яго сяброў (у тым ліку новых удзельнікаў), але таксама дапаможа расейцам рэфармаваць сваю ўласную краіну і рушыць наперад да дэмакратыі.

---

1. Да "права" на гуманітарнае ўмяшанне ў перыяд пасля халоднай вайны ўпершыню звярнулася дэлегацыя Вялікай

Брытаніі ў 1990 пасля таго, як Расея і Кітай не падтрымалі рэзалюцыю аб беспалётнай зоне над Іракам.

2. Паводле вызначэння АБСЕ




***Др. Іштван Д’ярмаці***

*Амбасадар Д’ярмаці цяпер з'яўляецца прэзідэнтам Міжнароднага цэнтра развіцця і дэмакратычнага пераходу і генеральным сакратаром Вугорскай Атлантычнай рады. Ён быў старшынёй Кансультацыйнай рады раззбраення пры Генеральным сакратару ААН, сябрам Рады Міжнароднага інстытута стратэгічных даследаванняў і Фонду абароннага каледжа НАТА і г. д. Ён зрабіў бліскучую кар'еру на дыпламатычнай службе ў якасці кіраўніка вугорскай дэлегацыі ў АБСЕ, старшыні аперацыйнай групы Вугоршчыны ў АБСЕ, генеральнага дырэктара ў палітыцы бяспекі і г. д. Ён таксама займаў пасады кіраўніка місій АБСЕ ў Грузіі, Чачэніі, намесніка міністра абароны ў палітыцы, старшага віцэ-прэзідэнта Інстытута Усход-Захад, кіраўніка Місіі назірання за выбарамі ў Малдове АБСЕ/БДІПЧ.*

*Амбасадар Д’ярмаці мае ступень магістра бізнэс-адміністравання, доктара палітычных навук і доктара філасофіі стратэгічных даследаванняў. Ён з'яўляецца прафесарам Універсітэта Мілтана Фрыдмана і Універсітэта Атаназ. Ён з'яўляецца аўтарам шматлікіх публікацый на тэму палітыкі бяспекі і абароны, еўрапейскай бяспекі, кіравання канфліктамі і абароннай палітыкі Вугоршчыны.*

# *ПОГЛЯД З БЕЛАРУСІ*

## *Ключавое значэнне ўступлення Беларусі ў НАТА для бяспекі Еўропы*

*Андрэй Саннікаў*

У канцы 20-га стагоддзя адбыліся дзве гучныя геапалітычныя падзеі, якія істотна паўплывалі на пасляваенную архітэктуру бяспекі: руйнаванне Берлінскага муру ў 1989 годзе, якое сімвалізавала аб'яднанне Нямеччыны, і крах таталітарнай Савецкай імперыі.

### Вакуум бяспекі 90-х

Пытанне змены архітэктуры бяспекі ў Еўропе выйшла на першую ролю пасля раскідання Савецкага Саюза ў 1991 годзе і адраджэння незалежных дзяржаў. Надзейнага развязання так і не было знойдзена.

Ні новастворанныя незалежныя дзяржавы, ні астатні дэмакратычны свет з усімі сваімі інстытутамі не ўсведамлялі складанасці задач, якія перад імі стаяць.

Заканчэнне халоднай вайны ўспрымалася як агульная перамога Захаду і яго "мяккай сілы", і лічылася, што заканчэннем місіі стане развязанне праблемы "жорсткай сілы", якая захоўвалася пасля супрацьстаяння дзвюх палітычных сістэм.

Інакш кажучы, адаптацыя Пагаднення аб звычайных узброеных сілах у Еўропе (ПЗУСЕ) і захадаў даверу, як і забеспячэнне кантролю над савецкай ядзернай зброяй праз пагадненні аб ядзерным раззбраенні паміж СССР і ЗША, былі прызнаныя дастатковымі гарантыямі захавання бяспекі.

Да таго ж, міжнародная бяспека, ядзернае раззбраенне і раззбраенне ў галіне звычайных узбраенняў не займалі першае месца ў спісе прыярытэтных задач новастворанных незалежных дзяржаў. Праблемы дзяржаўнага будаўніцтва, пільныя эканамічныя праблемы, неабходнасць правядзення рэформаў і нястача рэсурсаў дыктавалі рэальную герархію прыярытэтаў.

### Мінулыя памылкі, якія прычыніліся да катастрофы ў нашы дні

Дзяржавам, якія здабылі незалежнасць пасля раскідання СССР, давялося весці цяжкія перамовы аб бяспецы з Захадам і паміж сабой пад ціскам больш складаных праблем. Нядзіўна, што ў гэтых абставінах было дапушчана шмат памылак, і шмат якія стратэгічныя пастановы былі прынятыя спехам.

**Адной з найгрубейшых памылак стала ўхваленне правапераемнасці Расеі ў Радзе Бяспекі ААН ды іншых міжнародных арганізацыях. Такое ўхваленне стала вынікам махлярства Расеі падчас перамоў аж да фальсіфікацыі дакумента, які іншыя дзяржавы Супольнасці Незалежных Дзяржаў (СНД) падпісалі, не ведаючы дакладна, што менавіта яны падпісваюць[1].**

Іншыя сталыя сябры Рады Бяспекі ААН падтрымалі гэтую несумленную гульню і прызналі пераход правоў і абавязкаў ад таталітарнай дзяржавы да Расеі, тым самым перадаўшы мноства міжнародных вагароў уплыву непрадказальнаму ўтварэнню, усё яшчэ моцна ачмуранаму імперыялізмам. (Уявіце, што сёння няма Расеі ў якасці сталага сябра Рады Бяспекі ААН! Міжнародны мір і бяспека былі б у значна лепшым стане).

Дэмакратычны свет і сусветныя лідары разглядалі Расею пачатку 90-х як дэмакратычную дзяржаву, якая развіваецца, і далі ёй такую свабоду дзеянняў у міжнародных стасунках, якая выходзіла за рамкі разумнага. Акрамя таго, суб'екты вольнай рынкавай эканомікі былі зацікаўленыя ў велізарным расейскім рынку і былі ахвочыя крыху парушыць правілы, каб займець гэты рынак.

Такім чынам, калі Расея вынайшла тэрмін "блізкае замежжа", Захад хутка пераклаў яго як "near abroad" і прызнаў за ім права існавання ў бягучай палітычнай рэчаіснасці, тым самым спрыяючы заха-

ванню дамінантнага становішча Расеі на постсавецкай прасторы.

Спробы распачаць змястоўную дыскусію аб будучыні еўрапейскай бяспекі, не кажучы ўжо пра міжнародную бяспеку ў шырокім сэнсе, не былі сур'ёзнымі, нягледзячы на новыя магчымасці, якія ўзніклі пасля змены геапалітычнай сітуацыі і з'яўлення новых больш адкрытых каналаў сувязі паміж былымі супрацiўнікамі.

Стасункі паміж ЗША, якія засталіся звышдзяржавай, і рэшткамі ад іншай звышдзяржавы, Расеяй сталі больш празрыстымі, але па-ранейшаму захоўвалі значную ступень недаверу з абедзвюх старон.

Нягледзячы на ўсе адпаведныя заявы аб прыхільнасці да прынцыпаў дэмакратыі, вяршэнства права і павагі суверэнітэту сваіх суседзяў, Расея ніколі не мерылася іх адпускаць і разглядала ўсё новыя незалежныя дзяржавы як сваю “сферу ўплыву”.

## Новыя магчымасці і новыя супярэчнасці

Раскіданне СССР азначала неўнікнёны крах Варшаўскага пакту[2].

Меркавалася, што геапалітычныя змены, якія адбыліся ў канцы ХХ стагоддзя, ліквідуюць супярэчнасці паміж Усходам і Захадам, аднак жаданы вынік не быў дасягнуты, а ў шэрагу выпадкаў узніклі новыя супярэчнасці паміж краінамі былога Усходняга блока і краінамі былога Савецкага Саюза. Краіны былога Варшаўскага пакту і тры балтыйскія дзяржавы ведалі,

што іх чакае інтэграцыя з Захадам, і цвёрда рухаліся ў гэтым кірунку, хоць і з рознай хуткасцю.

Краіны былога СССР не маглі дазволіць сабе такую раскошу, як вольны геапалітычны выбар. Найперш ім давялося разабрацца з праблемай узаемнай залежнасці і з залежнасцю ад Расеі. Еўрапейскія рэспублікі былога СССР унеслі вызначальны ўклад у параўнальна бяспечны пераход краін Цэнтральнай Еўропы з палітычнай арэны Усходу на палітычную арэну Захаду, пагадзіўшыся стварыць СНД і падпарадкаваўшыся расейскаму панаванню.

У 90-я гады гэтыя супярэчнасці не здаваліся небяспечнымі, аднак яны спакваля сфармаваліся ў выразную лінію, якая зноў аддзяліла частку Еўропы. Пошукі новых механізмаў бяспекі ў канчатковым выніку прычыніліся да ўзнікнення дзвюх тэндэнцый, якія ў агульных рысах вызначылі сітуацыю ў рэгіёне ў XXI стагоддзі.

Гэтыя тэндэнцыі былі супрацьлеглымі:

- адна з іх — у добраахвотным далучэнні былых сябраў Варшаўскага пакту да НАТА пры шырокай падтрымцы насельніцтва.

- другая была абумоўленая спехам створаным новым вайсковым пактам, які кантралявала Расея, і ў рамках якога некалькі краін СНД былі вымушаныя падпісаць Дамову аб калектыўнай бяспецы (ДКБ)[3].

Варта адзначыць, што ДКБ была падпісаная значна раней за першы этап павелічэння НАТА ў 1998 годзе.

На пачатку 1994 года НАТА заснавала праграму "Партнёрства дзеля міру" ("Partnership for Peace"), па-

водле якой, на думку прэзідэнта ЗША Клінтана, НАТА мелася саступіць дарогу краінам Усходняй Еўропы, у тым ліку тым, якія былі часткай Савецкага Саюза, і нават самой Расеі. Мэтай было забеспячэнне супрацоўніцтва "для найлепшай будучыні Еўропы"[4]. Гэтая ініцыятыва НАТА была накіраваная на пошук глебы для супрацоўніцтва ў сферы бяспекі з Расеяй ды іншымі новастворанымі незалежнымі дзяржавамі. Расея неахвотна гэта прыняла. Аднак дзяржавы Цэнтральнай Еўропы былі незадаволеныя праграмай. Яны баяліся, што гэта можа стварыць перашкоды для іх паўнапраўнага сяброўства ў арганізацыі.

Яны баяліся адплаты Расеі і паводзіліся вельмі асцярожна. Яны не заяўлялі публічна аб сваіх імкненнях стаць сябрамі НАТА. У нейкі момант Польшча нават выступіла з ідэяй стварэння "NATO-bis", або ценявой НАТА, для Усходняй і Цэнтральнай Еўропы.

Стрыманасць і асцярожнасць былых сябраў Варшаўскага пакту была зразумелая: па-першае, ім трэба было пазбавіцца ад савецкіх войскаў на сваіх тэрыторыях, а гэта была няпростая і рызыкоўная задача, якая пагражала бязладдзем. Калі ім гэта нарэшце ўдалося, шлях у НАТА быў расчышчаны, і краіны Цэнтральнай Еўропы на чале з Вышаградскай групай пачалі працэс уступлення ў Паўночнаатлантычны альянс.

### А што з Беларуссю?

Як і ўсе іншыя незалежныя дзяржавы, якія ўзніклі пасля раскідання СССР (акрамя, вядома, краін Балтыі), Беларусь не магла б заявіць аб сваім імкненні ўступіць у НАТА, нават калі б захацела. Беларусь стала незалежнай на пачатку 90-х, але яна не стала свабоднай. Дэмакратычныя сілы ніколі не былі ва ўладзе ў Беларусі. На палітыку паўплывала рэтраградная камуністычная большасць у парламенце і ўрадзе, а таксама прыход да ўлады Лукашэнкі. Менавіта таму Беларусь не змагла сфармуляваць якуюнебудзь свабодную і незалежную канцэпцыю бяспекі.

Беларусь усё ж унесла свой уклад у еўрапейскую і міжнародную бяспеку і адыграла стваральную ролю ў перамовах аб бяспецы і раззбраенні ў галіне звычайных узбраенняў у Еўропе і аб ядзерных арсеналах былога СССР.

Расейская вайсковая экспансія ў Грузіі ў 2008 годзе і ва Украіне ў 2014 годзе засталася практычна беспакаранай, што было ўспрынятае Пуціным як слабасць Захаду і стала падставай для прыняцця пастановы аб пачатку поўнамаштабнай вайны супраць Украіны ў лютым 2022 года.

Былі і іншыя чыннікі, якія падрыхтавалі глебу для беспрэцэдэнтнай крывавай вайны ў Еўропе.

Адным з такіх чыннікаў стала дыктатура Лукашэнкі ў Беларусі, якая шмат у чым стала правобразам рэжыму Пуціна і забяспечыла ўсе неабходныя варункі для таго, каб расейская агрэсія стала магчымай, у тым ліку забеспячэнне лагістыкі.

**Дыктатура заўсёды азначае вайну, будзь гэта вайна дыктатара супраць уласнага народа або, як у выпадку нападу Расеі на Украіну – жахлівая вайна супраць сваіх суседзяў. Самы дзейсны спосаб прадухіліць вайну – пазбавіцца ад дыктатуры.**

Лукашэнку было дазволена цалкам выгодна існаваць на працягу амаль 30 гадоў, нягледзячы на жахлівыя парушэнні правоў чалавека і нават палітычныя забойствы. Ён лёгка пераадольваў кароткачасовыя "санкцыі", якія былі вельмі мяккімі да 2020 года. Нават у 2020 годзе, калі ў Беларусі адбылася рэвалюцыя, Захад рэагаваў вельмі марудна і неэфектыўна. Лукашэнка паражыў рэвалюцыю і жорстка расправіўся з пратэстоўцамі, а потым ахвотна даў тэрыторыю Беларусі свайму калегу-дыктатару Пуціну для нападу на Украіну. Вайна супраць Украіны рыхтавалася спрэс відавочна падчас маштабных расейска-беларускіх вайсковых вучэнняў на тэрыторыі Беларусі. Захад прыняў за лепшае не заўважаць небяспечную падкладку для будучай вайны ў гэтых вучэннях.

## Альтэрнатывы НАТА сёння не існуе

Варварская вайна Расеі супраць Украіны ясна дала зразумець, якім менавіта чынам трэба гарантаваць бяспеку ў Еўропе.

**Расея пагражае Еўропе, а Арганізацыя Паўночнаатлантычнага трактату забяспечвае яе абарону. Усё вельмі проста.**

Усе спробы ўключыць Расею ў агульную сістэму бяспекі, як і спробы "не адштурхнуць" Расею былі нічым іншым, як палітыкай уціхамірвання ваяўнічай дыктатуры.

Украіна ўсведамляла небяспеку, якая ідзе ад Расеі, і на працягу мноства гадоў спрабавала дамагчыся станоўчай і пэўнай пастановы аб сваім сяброўстве ў НАТА. Саміт НАТА ў Бухарэсце ў 2008 годзе часта крытыкуюць за тое, што ён не апраўдаў чаканняў Грузіі ды Украіны. Гэта падахвоціла Расею ўварвацца ў Грузію ў тым жа годзе і ва Украіну ў 2014 годзе. Аднак няўдачай у Бухарэсце стала не адмова ад ПДС (План дзеянняў для сяброўства ў НАТА) як такой, а саступка, якая была зробленая Пуціну. Ён выставіў ультыматум аб спыненні будучага павелічэння НАТА. І вось, пасля задавальнення гэтага ультыматуму Пуціна, яму дазволілі выйсці на саміце з прамовай, чым ён і скарыстаўся, каб яшчэ больш прынізіць Грузію і Украіну, дый самую НАТА.

Гэта была цяжкая навука для НАТА. Альянс у цэлым дрэнна даў рады сітуацыі, якая склалася ў 2008 годзе. Яшчэ больш цяжкім, трагічным і нават смяротным выявілася гэтая навука для Украіны, якая ахвяруе жыццём сваіх грамадзян, каб ратаваць сваю краіну і ўсю Еўропу ад бязлітасных забойцаў з Усходу.

Украіна мае законнае права патрабаваць прыняцця тэрміновай пастановы аб сваім сяброўстве ў НАТА, і такую пастанову неабходна прыняць неадкладна пасля перамогі Украіны ў вайне супраць Расеі.

У той жа час трэба адзначыць, што ўстойлівы мір у рэгіёне і ў Еўропе магчымы толькі пры свабоднай і дэмакратычнай Украіне ды свабоднай і дэмакратычнай Беларусі.

## Геапалітычнае значэнне Беларусі

Беларусь шмат у якіх аспектах займае надзвычай важнае месца ў Еўропе. Яе геапалітычнае значэнне абумоўленае наяўнасцю двух геаграфічных рэгіёнаў на ўсходніх і заходніх межах краіны. Гэта Смаленская брама і Сувалкскі калідор.

Смаленская брама — гэта зона паміж рэкамі Дзвіной і Дняпром, адзін з найбольш стратэгічна важных калідораў для трансгранічнага гандлю паміж Усходам і Захадам. Смаленская брама адыгрывае важную ролю не толькі для Расеі, але, у плане гандлю з Еўропай, і для Кітая — другой эканомікі свету.

У той жа час Смаленская брама ў Беларусі — гэта шлях, якім Расейская імперыя неаднаразова ўрывалася ў Еўропу і якім Расейская Федэрацыя цяпер уварвалася ва Украіну, каб захапіць Кіеў.

**З гісторыі вядома, што, калі Расея пачынала ўварванне ў Еўропу праз Смален-**

**скую браму, яе войскі даходзілі да Віслы ды ішлі далей — да Эльбы і Дуная.**

Сувалкскі калідор — гэта другі геастратэгічны абшар. Ён набыў асаблівае значэнне пасля раскідання СССР і краху Варшаўскага пакту. Ён надзвычай важны для бяспекі Балтыйскага рэгіёна, бо падзяляе Беларусь і расейскі эксклаў — Калінінград. Гэты калідор з’яўляецца адзіным аўтамабільным і чыгуначным маршрутам паміж Польшчай, Цэнтральнай Еўропай і краінамі Балтыі. У выпадку ўварвання блакаванне Сувалскага калідора адрэжа тры краіны ад кантынентальнй Еўропы. З гэтых прычын пэўныя эксперты называюць Сувалкскі калідор "ахілесавай пятой" НАТА.

Беларусь выступала як ключавы геапалітычны чыннік у перыяды напружанасці паміж Расеяй і Захадам. Ад яе палітыкі залежыць як абвастрэнне сітуацыі (калі Беларусь становіцца на старану Расеі), так і аслабленне напружанасці (калі Беларусь становіцца дэмакратычнай дзяржавай і ўз'ядноўваецца з Еўропай).

## Неўнікнёны выбар спосабу гарантавання бяспекі для Беларусі

З моманту набыцця Беларуссю незалежнасці абмяркоўваліся розныя варыянты гарантавання яе бяспекі. Неабходна было знайсці адэкватнае развя-

занне да таго, як надышоў бы час рабіць свабодны і якасны выбар што да пытанняў бяспекі.

На працягу даволі доўгага часу шмат якія дэмакратычныя апазіцыйныя палітыкі і цэнтры разглядалі ідэю стварэння Балтыйска-Чарнаморскага звязу, выстаўленую ў 1992 годзе Беларускім Народным Фронтам (БНФ). Прапаноўвалася вызваліць яго ад вайсковых баз НАТА і Расеі, каб ён паслужыў буферам паміж супрацьлеглымі сіламі.

Нешта падобнае прапаноўвала і Украіна. У красавіку 1993 года Кіеў падрыхтаваў праект стварэння Цэнтральна-Усходнееўрапейскай прасторы стабільнасці і бяспекі (ЦУЕПСБ)[5].

Відавочна, што гэта была спроба знайсці механізм гарантавання бяспекі, які абараніў бы Усходнюю Еўропу ад Расеі. Аднак гэта не спрацавала нават у выпадку Украіны, хоць яна і мела значна большую незалежнасць ад Расеі.

Геапалітычная канцэпцыя “Міжмор'я” існуе і дагэтуль у ЕЗ (на жаль, без Украіны і Беларусі), і з’яўляецца болей эканамічным праектам. Ясна, што гэта не можа быць развязаннем праблемы бяспекі для еўрапейскіх краін за межамі Еўразвязу.

Вайна, якую Расея распачала супраць Украіны, і рэакцыя свету паказалі, што ўсе рэгіянальныя дамоўленасці — гэта хісткія і ненадзейныя канструкцыі перад абліччам агрэсіі Расеі. Расея — гэта дзяржава, якая можа лёгка парушыць усякія міжнародныя абавязанні і дэнансаваць усякія ўмовы і пагадненні ў галіне бяспекі і раззбраення.

**НАТА – адзіны орган у галіне гарантавання бяспекі, які прыйшоў на дапамогу Украіне, і далей дае разнастайную дапамогу і падтрымку.**

Сёння Украіна цалкам справядліва пачала перамовы аб гарантыях бяспекі, накіраваных на абарону краіны ад паўтарэння расейскай агрэсіі ў будучыні. Такія гарантыі немагчымыя, калі яны не ўлічваюць і не ўключаюць у сябе свабодную і дэмакратычную Беларусь.

Нядаўні гістарычны досвед паказаў, што Крэмль, быўшы крыніцай бесперапыннай агрэсіі, выкарыстоўвае Беларусь, што знаходзіцца пад кіраваннем дыктатарскага рэжыму, як плацдарм для вайны супраць Еўропы і будзе выкарыстоўваць датуль, пакуль краіна не стане свабоднай і дэмакратычнай.

Свабоднай Беларусі неабходна будзе як мага хутчэй стаць сябрам НАТА, каб абараніць сваю незалежнасць і забяспечыць будучы росквіт.

У той жа час Беларусь патрэбная НАТА, каб прадухіліць магчымае выкарыстанне Расеяй гэтага “балкона” для агрэсіі ў будучыні і засланіць відавочную зеўру ў еўрапейскай бяспецы.

---

1. https://www.un.org/en/about-us/member-states/russian-federation

2. Варшаўскі пакт — пагадненне аб калектыўнай абароне, укладзенае паміж Савецкім Саюзам і сямю іншымі яго дзяржавамі-сатэлітамі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы: Албаніяй, Балгарыяй, Чэхаславаччынай, Усходняй

Нямеччынай, Вугоршчынай, Польшчай і Румыніяй (Албанія выйшла з Пакту ў 1968 годзе).

3. Дамова была падпісаная 15 траўня 1992 года ў Ташкенце кіраўнікамі шасці краін: Арменіі, Казахстана, Кіргізстана, Расеі, Таджыкістана і Узбекістана. У снежні 1993 года Дамову падпісала і Беларусь пад ціскам з боку Расеі і камуністычных сіл унутры краіны. Нягледзячы на такі ціск і нават шантаж Расеі, Украіна здолела ўнікнуць гэтай пасткі.

4. https://heinonline.org/HOL/LandingPage?handle=hein.journals/dsptch13&div=20&id=&page

5 У ЦУЕПСБ меліся ўвайсці краіны Балтыі, Украіна, Беларусь, Польшча, Чэхія, Славаччына, Вугоршчына, Аўстрыя, Балгарыя і Румынія.



***Андрэй Саннікаў*** *— кіраўнік Фундацыі "Еўрапейская Беларусь".*

*Кар'ерны дыпламат, працаваў у МЗС Беларусі, у тым ліку намеснікам міністра замежных спраў у 1995-96 гадах.*

*Узначальваў беларускія дэлегацыі на перамовах аб звычайным і ядзерным раззбраенні.*

*Падаў у адстаўку на знак пратэсту супраць палітыкі Лукашэнкі ў 1996 годзе.*

*Быў кандыдатам на прэзідэнцкіх выбарах 2010 года ў Беларусі і меў другі велічынёй адсотак галасоў выбаршчыкаў. Быў арыштаваны, кінуты ў турму КДБ і асуджаны за арганізацыю мірнага пратэсту супраць фальсіфікацыі выбараў. Пасля вызвалення ў 2012 годзе мусіў з'ехаць з Беларусі. Жыве і працуе ў Еўропе.*

## *ПОГЛЯД З УКРАІНЫ*

# *НАТА як аптымальная мадэль будучай бяспекі будучай Беларусі*

***Паўло Клімкін***

Сёння бяспека Беларусі знаходзіцца ў самым нізкім пункце з моманту набыцця ёю незалежнасці. Яе радыкальнае пагаршэнне вызначаецца шэрагам вельмі розных чыннікаў, якія пачынаюць складацца ў адну мазаіку. Сістэмны аналіз гэтых чыннікаў немагчымы ў рамках кароткага тэксту і патрабуе залучэння крыніц па-за публічным доступам, асабліва для мадэлявання іх узаемнага ўплыву і магчымага «рэзананснага» або нават кумулятыўнага эфекту. Зрэшты, асноўныя элементы, якія ўплываюць на бяспеку Беларусі, цалкам зразумелыя для агульнага аналізу сітуацыі.

**Па-першае,** крытычны ўзровень каардынацыі замежнай і ўнутранай палітыкі з РФ.

Гэта не азначае, што беларускае кіраўніцтва не здольнае прымаць свае пастановы ва ўнутранай палітыцы, але іх поле абмежаванае фінансавай і эканамічнай залежнасцю ад РФ. "Гарманізацыя" эканамічнай прасторы зробіць гэтую самастойнасць больш фармальнай. У пытаннях замежнай палітыкі

прасторы для манеўру ў існых варунках практычна няма.

**Па-другое,** Беларусь з'яўляецца сябрам АДКБ (Арганізацыі Дамовы аб калектыўнай бяспецы), але адначасова з'яўляецца адзінай краінай з яе, якая дала сваю тэрыторыю і інфраструктуру для агрэсіі РФ супраць Украіны. Гэта зрабіла Беларусь не толькі фармальна-юрыдычным, згодна з дакументамі АДКБ, але і фактычным хаўруснікам РФ, які павінен несці палітычную і юрыдычную адказнасць за наступствы агрэсіі. Накладзеныя на сёння санкцыі з'яўляюцца часткай гэтай адказнасці. Іх нельга касаваць або аслабляць да заканчэння вайны і, адпаведна, вызначэння і практычнага ажыццяўлення яе часткі адказнасці. Іншыя краіны АДКБ займаюць фармальна нейтральную пазіцыю і працягваюць "балансаванне". Для Беларусі шлях да вяртання гэтага статус-кво ўжо замкнёны, пункт невяртання пройдзены. Пры гэтым Беларусь нясе юрыдычную адказнасць за даванне сваёй тэрыторыі як плацдарма для размяшчэння расейскіх сіл, і таксама падзяляе адказнасць за ўсе злачынныя дзеянні РФ.

**Па-трэцяе,** інфраструктура Беларусі не толькі далей выкарыстоўваецца для размяшчэння расейскіх узброеных сіл, але, больш за тое, для ўдараў па тэрыторыі Украіны. Гэта азначае, што кіраўніцтва Беларусі дало згоду на ўдзел у працягу агрэсіі, і такім чынам яе адказнасць безупынна расце. Гэта ставіць пытанне аб неабходнасці і легітымнасці дзеянняў для прадухілення такіх дзеянняў на тэрыторыі самой Беларусі.

**У рамках міжнароднага права і, у тым ліку, Статута ААН, Украіна мае права на самаабарону, і гэтае права не абмежаванае тэрыторыяй Украіны.**

Адпаведна, далейшая эскалацыя санкцыйнага ды іншага ціску таксама цалкам лагічная і адпавядае ключавым прынцыпам міжнароднага права.

**Па-чацвёртае,** на тэрыторыі Беларусі размяшчаецца расейская тактычная ядзерная зброя. Гэта робіць Беларусь цэллю для спецыяльнага маніторынгу НАТА і яе ўдзельнікаў, а таксама не выключае планавання рэагавання на пагрозы ядзернага ўдару з тэрыторыі Беларусі, у тым ліку перанацэльванне часткі сродкаў стрымлівання. На тэрыторыі Беларусі ёсць носьбіты гэтай тактычнай ядзернай зброі, што ў сэнсе стратэгічнага стрымлівання ставіць яе на адзін узровень з РФ, і, адпаведна, мяняе характар неабходных захадаў рэагавання з улікам набліжэння размяшчэння ядзернай зброі і яе носьбітаў да краін НАТА і Украіны.

**Па-пятае,** узровень інфільтрацыі ўзброеных ды іншых структур з боку РФ дасягнуў крытычнай адзнакі, і ўжо немагчыма вызначыць, наколькі кіраўніцтва Беларусі іх кантралюе. Можна меркаваць, што ўжо цяпер РФ можа ажыццяўляць эфектыўны кантроль над элементамі гэтых структур і, магчыма, нават над самімі структурамі ў цэлым.

**Па-шостае,** удаваны “ўдзел” Лукашэнкі ў перамовах вакол уціхамірвання путчу Прыгожына робіць Беларусь часткай расейскай унутранай палітыкі, а раз-

мяшчэнне рэшткаў “Вагнера” на яе тэрыторыі навочна гэта пацвярджае. Больш за тое, Беларусь становіцца часткай дзеянняў “Вагнера” за мяжой і легітымнай цэллю для супрацьдзеяння ім.

**Па-сёмае,** РФ выкарыстоўвае тэрыторыю Беларусі для правакацый у дачыненні да Польшчы і Літвы, свядома і штучна ствараючы "напружанне" на мяжы шляхам наладжвання ланцужкоў дастаўкі "ўцекачоў". Суседнія з Беларуссю краіны мусяць выдаткоўваць багата рэсурсаў на змяншэнне гэтых пагроз, як фактычных, так і медыйных.

Нават без далейшай дэталізацыі гэтых чыннікаў відавочна, што ўсякія падзеі, звязаныя з РФ, будуць як наўпрост, так і ўскосна адбівацца на бяспецы Беларусі. Больш за тое, Беларусь у існых варунках уразлівая ў выпадку ўсялякіх змен альбо нават рухаў у расейскай унутранай палітыцы.

РФ разглядае Беларусь як частку "расейскага свету", у чым сыходзяцца і расейскае кіраўніцтва, і расейскае насельніцтва. Адпаведна, Беларусь з'яўляецца "ўмоўна" незалежнай, бо знаходзіцца ў рамках вызначальнай сферы ўплыву РФ. Канструкцыя "саюзнай дзяржавы" — часовая для РФ; яе мэтай з'яўляецца фактычнае паглынанне Беларусі.

Выгадная пазіцыя Беларусі ў выкарыстанні сваёй тэрыторыі і юрысдыкцыі для атрымання выгады ад абыходу накладзеных на РФ санкцый дапамагала эканоміцы краіны, але пасля 24 лютага 2022 года гэтая роля зведзеная на нішто. У варунках санкцый беларуская эканоміка крытычна залежыць ад расейскай, нават пры спробе збалансаваць гэта за кошт

Кітая. Расейскі бізнэс, непарыўна звязаны з расейскімі сілавымі кланамі, відавочна, выкарыстоўвае гэтую сітуацыю для ўмацавання пазіцый у беларускай эканоміцы.

Захаванне фармальных атрыбутаў незалежнасці магчымае выключна пры падпарадкаванні РФ усіх элементаў дзяржаўнага ладу Беларусі, але нават такая опцыя з'яўляецца рызыкай для Крамля. Змены ў свядомасці беларусаў, умацаванне ўласнай ідэнтычнасці, змена пакаленняў — усё гэта будзе спакваля адмяжоўваць Беларусь ад РФ. Сённяшняе кіраўніцтва Беларусі ў значнай ступені абапіраецца на пакаленне, якое яшчэ памятае СССР, якое тужыць аб ім і бачыць у сучаснай Расеі яго рэінкарнацыю. Нават у варунках татальнай прапаганды і дамінавання афіцыйных наратываў відавочна, што беларускае грамадства здольнае да самастойнага мыслення і аналізу сітуацыі. Расейскае дамінаванне відавочна будзе выклікаць супраціў і пратэст, і нават у выпадку яго мернага і павольнага развіцця сітуацыя для РФ будзе толькі пагаршацца. Гэта азначае, што час працуе супраць Крамля і сённяшні ўзровень кантролю над Беларуссю не гарантаваны, а значыць, статус-кво можа быць толькі кароткатэрміновым і не можа задавальняць РФ на перспектыву.

**Усплёск пратэстаў пасля апошніх сфальсіфікаваных прэзідэнцкіх выбараў з аднаго боку пераадолены ўладай, але з другога даў шмат каму нечуванае дагэтуль адчуванне здольнасці ўплываць на падзеі**

**ў краіне. Нават у стоеным стане гэтае адчуванне складае фундаментальны выклік як сённяшняму беларускаму, так і расейскаму кіраўніцтву.**

Расейская агрэсія супраць Украіны часова абараняе рэжым у Беларусі, бо пачатак аднаго з наяўных у РФ планаў пераўтварэння Беларусі ў гэтых варунках створыць новыя, у тым ліку непрадказальныя рызыкі. Але Крэмль будзе ахвочы пайсці на іх, калі будзе адчуваць, што час працуе супраць яго і здольны іх мінімізаваць. Гэта стварае вельмі небяспечную сітуацыю для Беларусі і ставіць пытанне аб сталым і доўгатэрміновым бачанні бяспекі.

**Расейская агрэсія супраць Украіны канчаткова разбурыла існую сістэму бяспекі ў Еўропе. Вяртанне папярэдняй сітуацыі, нават з усімі яе хібамі, немагчымае. Мадэль бяспекі для Украіны мае стаць часткай еўрапейскай мадэлі. У агульных рысах ёсць тры групы развязанняў.**

**Першая** прадугледжвае пабудову ўстойлівай Украіны з моцным і мабілізаваным сектарам бяспекі і абароны, з даваннем неабходнага ўзбраення як аб'ёмам, так і яго тыпамі, а таксама з належнай фінансавай падтрымкай, гэта значыць ператварэнне Украіны ў асаблівага “дзікабраза”. Практычная рэалізацыя гэтай мадэлі магчымая праз шэраг пагадненняў або дамоўленасцяў з асобнымі краінамі і/або

міжнароднымі арганізацыямі. Гэтую мадэль часта называюць "ізраільскай", хоць гэта не зусім дакладна. Ізраіль мае ядзерную зброю, хаця і неафіцыйна, а Украіна не мае, і гэта — фундаментальнае адрозненне. Акрамя таго, дамоўленасці Ізраіля з ЗША змяшчаюць паняцце “якаснай вайсковай перавагі”, якая мае захоўвацца за Ізраілем. У выпадку Украіны неабходная аналагічная канцэпцыя з умоўнай назвай "якасная здольнасць стрымлівання", якая мае быць інтэграваная ў агульную канцэпцыю НАТА для стрымлівання РФ яшчэ да сяброўства ў НАТА.

**Другая** опцыя прадугледжвае сістэму гарантый бяспекі Украіны — адна- або шматстаронніх. Гэта маюць быць юрыдычна афармленыя і надзейныя гарантыі такога ж зместу, што, напрыклад, ЗША даюць Японіі або Паўднёвай Карэі на падставе канцэпцыі расшыранага стрымлівання. Відавочна, што ЗША павінны быць часткай сістэмы гэтых гарантый, але тады ўзнікае пытанне, чаму адразу не перайсці да сяброўства Украіны ў НАТА. Бо інакш адбудзецца фрагментацыя стратэгіі НАТА на еўрапейскай прасторы, а салідарнасць для сябраў Альянсу – чыннік крытычны.

І, нарэшце, **трэцяя** опцыя прадугледжвае сяброўства Украіны ў НАТА. Гэта адзіная з опцый, якая сталая і зразумелая ў сэнсе абавязкаў і стрымлівання, яна не пакідае "шэрых зон" і прастор няпэўнасці — юрыдычна і палітычна.

Відавочна, што гэтыя опцыі не выключаюць адна адну і могуць адна з адной перасякацца. Таксама відавочна, што паспяховая інтэграцыя Украіны ў ЕЗ

немагчымая без устойлівага і надзейнага складніка бяспекі, якім можа ў перспектыве быць толькі сяброўства ў Альянсе.

У сувязі з гэтым узнікае пытанне аб месцы Беларусі ў сістэме еўрапейскай бяспекі і мадэлі бяспекі для яе, бо сённяшняя сітуацыя можа весці толькі да кантролю Беларусі з боку РФ, з фармальным захаваннем атрыбутаў дзяржаўнасці альбо без іх. Спробы анэксаваць Беларусь выклічуць доўгатэрміновы пратэст у беларускім грамадстве, мінімізаваць які РФ не здолее. Беларусь як незалежная дзяржава не можа заставацца хаўруснікам РФ, бо гэта цягне за сабой рызыкі, апісаныя вышэй. У той жа час, будучая сістэма еўрапейскай бяспекі выключае "шэрыя зоны", бо гэта генеруе няпэўнасць і таму стварае дадатковую небяспеку. Спакуса захоўваць “нейтральную” пазіцыю будзе ў Беларусі з улікам гісторыі, ментальнасці і настрояў. Малдова — не вельмі ўдалы, але ўсё ж прыклад такога жадання. Зрэшты, "шэрыя зоны" ствараюць рызыкі, якія нават складана дакладна прадказаць.

**Адной з ключавых асаблівасцей будучай еўрапейскай сістэмы бяспекі мае стаць адсутнасць такіх зон.**

Хоць гэта выглядае як «ненавуковая фантастыка», аптымальным варыянтам для Беларусі з'яўляецца ўваходжанне ў еўрапейскую сістэму бяспекі з наступным сяброўствам у НАТА. Толькі такі варыянт

мінімізуе і амаль нівелюе існыя і сёння патэнцыйныя рызыкі. Уявіць гэты варыянт у існых рэаліях складана, але на перспектыву цалкам магчыма. Большасць беларусаў сёння, магчыма, не здольная і не хоча ўявіць сябе часткай НАТА, але яшчэ некалькі гадоў таму — да 2014 года — большасць украінцаў станоўча ставіліся да РФ. Больш за тое, сённяшні фактычны кіраўнік Беларусі Лукашэнка быў самым папулярным з замежных кіраўнікоў сярод украінцаў.

На працягу вельмі доўгага часу шмат каму здавалася, што знаходжанне Украіны ў “шэрай зоне” ўсіх задавальняе і нават дае магчымасць манеўраваць паміж Захадам і РФ. Гучалі ідэі аб "гарадах — злучальным звяне" паміж імі. Памылковасць гэтага падыходу ў тым, што такое звяно мае быць суб'ектным і самадастатковым, што ў існых сёння варунках, па-першае, недасяжна, а па-другое, не дае Украіне, а ў будучыні і Беларусі рэалізаваць сваю еўрапейскую ідэнтычнасць.

### Украіна і Беларусь супольна належаць да Цэнтральнай Еўропы.

Выкарыстанне квазісавецкай атрыбутыкі ніякім чынам не можа схаваць фундаментальныя адрозненні ў ментальнасці расейцаў і беларусаў. Аднавіць сваю ідэнтычнасць беларусы змогуць толькі зацвердзіўшы прыналежнасць да заходняй цывілізацыі, што прадугледжвае прыняцце і выкарыстанне заходняй мадэлі бяспекі, якой сёння з'яўляецца НАТА. Толькі такое развіццё падзей здольнае таксама зліквідаваць узнік-

лую пэўную варожасць паміж Украінай і Беларуссю. Больш за тое, такія працэсы стануць базай для фармавання новай, належным чынам збалансаванай цэнтральнаеўрапейскай ідэнтычнасці як часткі агульнаеўрапейскай. Бо насцярожанасць да Беларусі існуе і ў іншых суседзяў — Польшчы і Літвы.

Прасоўванне Беларусі да НАТА і ЕЗ запатрабуе выканання ключавых крытэрыяў — дасягнення ўстойлівай дэмакратыі і вяршэнства права. Часткай еўрапейскіх інстытутаў можа стаць толькі новая Беларусь, аднак падзеі пасля апошніх маніпуляцый з прэзідэнцкімі выбарамі паказалі, што патэнцыял грамадзянскай свядомасці ў Беларусі ёсць, як і жаданне быць пачутымі і рэалізаваць свае правы. Менавіта гэта і ёсць гарантыя будучыні Беларусі. Усякі іншы шлях з'яўляецца шляхам ператварэння Беларусі ў правінцыю РФ.

**Шлях да еўрапейскіх інстытутаў можа быць значна хутчэйшым, чым шмат каму здаецца. Украіна можа і мае стаць для Беларусі рухавіком, як яна стала рухавіком для Малдовы, і гэта адбудзецца ў агляднай перспектыве.**



***Паўло Клімкін*** *— сузаснавальнік Цэнтра нацыянальнай устойлівасці і развіцця, былы міністр замежных спраў Украіны. Мае ступень магістра фізікі і практычнай матэматыкі Маскоўскага фізічна-тэхнічнага інстытута. Да прыходу ў МЗС Украіны ў 1993 годзе працаваў навуковым супрацоўнікам у Акадэміі навук Украіны, дзе ягонымі асноўнымі спецыялізацыямі былі кантроль над узбраеннямі і бяспека, ядзерная бяспека, энэргетычная бяспека, ЕЗ і НАТА. Клімкін узначальваў перамоўную групу для Пагаднення аб асацыяцыі паміж ЕЗ і Украінай і бязвізавым рэжыме ЕЗ для Украіны. У структуры МЗС працаваў у Нямеччыне і Вялікай Брытаніі, у тым ліку ў Нямеччыне ў якасці амбасадара. Клімкін з'яўляецца сябрам управы фонду "Повернись живим".*



*Дагаворныя бакі пацвярджаюць сваю веру ў мэты і прынцыпы Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і сваё жаданне жыць у свеце з усімі народамі і ўрадамі.*

*Дагаворныя бакі напоўнены рашучасцю абараняць свабоду, агульную спадчыну і цывілізацыю сваіх народаў, заснаваныя на прынцыпах дэмакратыі, свабоды асобы і законнасці. Дагаворныя бакі маюць на мэце ўмацаванне стабільнасці і павышэння дабрабыту ў Паўночнаатлантычным рэгіёне. Дагаворныя бакі поўныя рашучасці аб'яднаць свае намаганні з мэтай стварэння калектыўнай абароны і захавання міру і бяспекі. Таму Дагаворныя бакі дасягнулі пагаднення аб ніжэйпададзенай Паўночнаатлантычнай дамове.*

Паўночнаатлантычны дагавор,

Вашынгтон, Федэральная акруга Калумбія,
4 красавіка 1949 г.